Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Замена адрасу: 1 экзэмпляр — 20 к. месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрскі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрскі наперад тэксту 1 р. — к. За радок капітэрскі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвешчыя на 50 проц. дарожэй. Зьніжэньня тарыфу бярэцца 10 проц. штоту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакладны . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Бескрацоўн. і чырвонаармейцы за дакладны . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 68 (2557) Серада, 27-га сакавіка 1929 г.

За арганізаванае скарыстаньне новых льгот па с.-г. падатку.

Калі сялянства БССР цалкам скарыстае ўсе новыя льготы па с.-г. падатку, дык сума гэтага падатку паменшыцца амаль на 2 міл. руб. Але гаспадарчыя палепшаньні, за якія даюцца льготы, павялічаць пасеўную плошчу і ўраджай. Адно варта другога, і трэба дабівацца поўнага скарыстаньня гэтых льгот.

Трэба прызнаць, што яшчэ вельмі мала зроблена ў справе растлумачэньня сялянству новага с.-г. падатку. Апарат ледзь раскачваецца. Мы павінны высунуць агітацыйную працу па с.-г. падатку на адно з першых месц у падрыхтоўцы да пасеўнае кампаніі. Інакш ня будзе скарыстана так вялічэзная сіла пра якую гавораць пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б)—гаспадарчая зацікаўленасьць і ўласны пачын бяднацка-серадняцкіх мас сялянства.

Цяпер у шмат райёнах адбываюцца зьезды саветаў. Па іх трэба шырока абгаварыць новыя льготы па с.-г. падатку. Райвыканкомы і сельсаветы павінны грунтоўна вывучаць новы закон і на ўсіх сходах, канфэрэнцыях і нарадах інфармаваць удзельнікаў, за што, як і ў якім разьмеры даюцца льготы, што трэба зрабіць, каб атрымаць іх. У агітацыйнай працы асаблівую ролю адыграюць агранамы: ведаючы мясцовыя агранамічныя ўмовы і патрэбы кожнага сельсавету, яны могуць адразу паставіць агітацыю на практычную глебу і падкрэсьліваць значэньне тых льгот, якія асабліва карысна і лёгка атрымаць у данай мясцовасьці. На парады агранамічных сіл павінна апірацца і агітацыйная праца па с.-г. падатку сельскіх партыйных арганізацый, ячэек ЛКСМБ і іншых арганізацый.

Неабходна памятаць, што ня ўсе льготы можна скарыстаць у кожнае мясцовасьці, і што ня варта агітаваць за распашку залежы і атрыманьне за гэта льготы там, дзе залежы ўсім няма. Таксама не патрэбна агітацыя за арганізацыю малочных арцелей там, дзе яны ёсьць. Агітаваць трэба за тое, чаго няма і што можна быць праведзена ў кожнай данай мясцовасьці. Значыцца, з вялізарнага пераліку льгот пра сельск.-гасп. падатак трэба асабліва высоўваць некаторыя, але на іх націскаць са ўсёй сілай.

Агітацыі мала. Неабходна адразу наміціць, што і дзе трэба зрабіць. Райвыканкомы і сельсаветы павінны яшчэ раз праверыць свае пляны правядзеньня пасеўнае кампаніі і дадаць у іх тое, што вынікае з новага закону пра с-г. падатак. Вясковы актыў, беднота, партыйныя і комсамольскія ячэйкі па вінны сабрацца, абгаварыць новыя льготы і намеціць, якую льготу можна і трэба правесьці ў кожным населішчы.

Абмеркаваўшы гэта і склаўшы рэальны плян, трэба надрыхтаваць грамадзкасьць і потым ставіць пытаньне на агульных сходах. Паміж суседніх вёсак і с-саветаў можна нават утварыць спаборніцтвы ў справе максымальнага скарыстаньня новых льгот і падвышэньня ўраджаю, па прыкладу вытворчых спаборніцтваў у прамысловасьці. Ва ўсякім разе трэба дабівацца, каб тое ці іншае мерапрыёмства, за якое даецца льгота, прымалася і праводзілася ўсёй грамадой, бо тады і разьмер льгот павялічваецца: і карысныя вынікі ў справе падвышэньня ўраджаю будуць значна большыя. Пры тым ёсьць такія льготы, якія можна атрымаць толькі грамадой, напрыклад, палавінная скідка з норм даходнасьці кароў для членаў малочных арцеляй. Можна загадя сказаць, што заможнікі і кулацтва, даведаўшыся пра гэтую льготу, палезуць ў малочныя арцелі і саюзы. Задача ўсіх культурных і грамадзкіх сіл вёскі—не дапусьціць гэтага, змагацца в арганізацыяй фальшывых, кулацкіх арцеляй і давесьці льготу да таго, каму яна прызначана,—да беднаты і серадняка.

Асабліва трэба арганізаваным спосабам скарыстаць 10 процантную скідку з падатку за прасьцейшыя агранамічныя палепшаньні. Кулакі пазбаўляюцца права на гэтую льготу і, зразумела, падымуць буру супроць яе. Між тым закон і дадатковыя пастановы АВК устанаўляюць шырокі пералік прасьцейшых агрэпалепшаньняў, за якія даецца льгота; кожная вёска можа выбраць і лёгка правесьці адно-два ці больш з гэтых палепшаньняў. Але нехта павінен узяць на сябе пачын. Тут роля партыйных і грамадзкіх арганізацый будзе рашучай.

Часу засталося мала. Тым шпарчэй і шырэй трэба разгарнуць агітацыю і арганізаванае скарыстаньне новых льгот.

М. К.

МЕРЫ ДА ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

МАСКВА. УсеЦСПС прапанаваў усім прафарганізацыям правесьці ў жыцьцё шэраг практычных мерапрыёмстваў з мэтаю рашучага падвышэньня прадукцыйнасьці працы, аздараўленьня працоўнага рэжыму і ўзмацненьня барацьбы з бязгаспадарчасьцю на прадпрыёмствах.

Абгаварваючы факты паслабленьня працдысцыпліны, УсеЦСПС прапануе поруч з растлумачальнаю працаю і ўзмацненьнем культурна-асьветных мер ужываць адначасова меры адміністрацыйнага ўзысканьня, асабліва за пагрозу і зьняважаньне адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу. Прафорганы і фабзавкомы павінны ў гэтых выпадках адмаўляць вінаватым у абароне як у РКК, так і ў судзе.

УсеЦСПС прапануе прафарганізацыям аказаць гаспадарчым органам усямерную дапамогу пры выкананьні пастановы СНК СССР аб правядзеньні сыстэмы адначальня ў прадпрыёмстве з тым, каб кіраўнікі прадпрыёмства, загадваючы самастойна апэратыўнай дзейнасьцю, несьлі-б за яе поўную адказнасьць. Між іншым, прафсаюзы павінны забясьпечыць адміністрацыі прадпрыёмства магчымасьць самастойнага накладаньня на рабочых і служачых, парушыўшых працоўную дысцыпліну, розных роду ўзысканьні аж да звальненьня. У РКК павінны разглядацца толькі скаргі асоб, незадаволеных накладзеным узысканьнем. Рабочая частка РКК пры абмеркаваньні канфліктаў павінна падтрымліваць прапанову адміністрацыі аб звальненьні асоб, вінаватых у сыстэматычным і злосным парушэньні правіл унутранага распарадку.

Падтрымліваючы розным чынам адміністрацыю прадпрыёмстваў у справе ўстанаўленьня правільнага працоўнага рэжыму сярод рабочых і служачых, прафсаюзы павінны адначасова бараніць апошніх ад магчымых з боку асобных адміністратараў выпадкаў асабістых разрахункаў з непажаданымі ім рабочымі і служачымі, а таксама ад спробаў ускладаць на рабочых віну за бязгаспадарчасьць, у якой вінавата адміністрацыя.

УсеЦСПС прапануе прафарганізацыям нямедліць сумесна в гаспадарчымі органамі да пераразмеркаваньня ўнутры прадпрыёмства лішку рабочае сілы за кошт часовага спыненьня прыёму новых рабочых і служачых.

На прадпрыёмствах, дзе асабліва нядобра стаіць справа па выкананьні вытворчых праграм і працоўнае дысцыпліны, распачаць арганізацыю часовых кантрольных камісій па вывучэньні стану вытворчасьці і працоўнае дысцыпліны. УсеЦСПС прапануе асьвятляць факты падзеньня працоўнае дысцыпліны пры дапамозе плякатаў, выставак і г. д., а таксама разгарнуць працу на вытворчай асьвеце адсталых груп рабочых.

ЯПОНІЯ І КІТАЙ.

ШАНХАЙ, 25-3. Водлуг паведамленьняў нанкінскага агенцтва Го-Мінь згода аб пагоджаньні цзынаньскага інцыдэнту прадугледжвае: эвакуацыю Шаньдуню, абарону пражываючых там японцаў, утварэньне камісіі для расьледаваньня прычын інцыдэнту і вызначэньня страт бакоў.

Нанкінскі ўрад абавязваецца скарыстаць свой уплыў для спыненьня анты-японскага байкоту і агітацыі. „Норт Чайна Дэйлі Ньюс" паведамляе, што Фын-Юй-сян разасла ў абазную тэлеграму, у якой ён абвінавачвае ў утварэньні становішчы абодвы бакі. Водлуг слоў Фын-Юй-сяна, Чан-Кай-шы вінаваты ў нерашэньні ўлады.

Новыя пошукі Амундсэна

ОСЛО, 25-3. Лейтэнант Амундсэн пасьля сьвяточнага парадкам да паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Осло з просьбою каб савецкія навуковыя і прыбярэжныя экспедыцыі прымалі меры да пошукаў экіпажу самалёту «Латана» і з прапановаю аб спэцыяльнай [illegible]. Лётчык капітан [illegible] Бістэрдам, [illegible] ён гатоў прыняць [illegible] у [illegible] экспедыцыі ў [illegible].

Палітычная забастоўка на буйнейшай фабрыцы ў Аўстрыі.

ВЕНА, 25-3. Сёньня рабочыя буйнейшае ў Аўстрыі папяровай фабрыкі „Лейкам Іёзэфсталь" абвясьцілі забастоўку ў адзнаку пратэсту супроць учарайшага нападу хэймвэру і патрабавалі звальненьня фашысцкіх рабочых. Дырэкцыя вгадзілася распачаць перамовы ў тым выпадку, калі будзе спынена забастоўка. У поўдзень забастоўка была спынена. Такія-ж пратэсты рабочых келі месца на шэрагу прадпрыёмстваў у Грацы.

Рабочыя выступаюць супроць фашыстаў.

ВЕНА, 25-3. У Бадэне (недалёка Вены) адбылася маніфэстацыя атраду хэймвэра (фашысцкая арганізацыя) у колькасьці 400 чалавек. Контр-маніфэстацыя, арганізаваная камуністамі і сацыял-фашысцкім камітэтам рабочае абароны, паліцыя забараніла. Пасьля сходу, паліцыя забараніла. Пасьля сходу, рабочая моладзь, у ліку якой былі і камуністы, абкружыла і абвітала групу фашыстаў. Бургомістр Шнэдэрдольфэ (фашыст) цяжка паранены.

ВАЙНА Ў КІТАІ ПАЧАЛАСЯ.

ШАНХАЙ 25-3. Водлуг вестак чужаземнага друку, ваенныя дзеяньні паміж нанкінцамі і гуансійцамі ўжо пачаліся недалёка Цзю цзяна (Цзянцзі). У Ханьчжоу прыбываюць параненыя. Узмоцнена варта шанхайска-нанкінскае чыгункі, забаронены стачкі, дэманстрацыі, мітынгі і г. д.

КАНТОНСКІЯ ГЕНЭРАЛЫ СУПРОЦЬ ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ШАНХАЙ, 25-3 Нарада кантонскіх ваенных дзеячоў пасьлядо Чан-Кай-Шы пратэст супроць арышту Лі-Ці-Сіна і патрабуе неадкладнага растлумачэньня прычын пагражаючы ваеннымі дзеяньнямі. У кантонскім арсэнале вядзецца ўзмоцненая праца. У Гуансі і ў Гуандуне распачата мабілізацыя; штаб войск абедзьвюх правінцый пераносіцца ў Сяогуань; войска рухаецца ў напрамку да правінцыі Хунань. Прыехаўшы ў Кантон Лі-Цзун-Жэн для нарады з ваеннымі дзеячамі пасьля нарады выляцеў у Ханькоу «для кіраўніцтва справамі».

БУРЖУАЗЕЯ МОЖА ВЕРЫЦЬ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАМ.

БЭРЛІН, 25-III. У кіраўнічых камуністычных колах лічаць загад міністра ўнутраных спраў Гржэзінскага сапраўды пагражаючай забаронай нямецкае кампартыі і чырвонага саюзу франтавікоў, ацэньваецца, як выступленьне кіраўнічае верхавінкі сацыял-дэмакратаў, якое адбылося пад націскам буржуазных партый.

За апошні час розныя групы буржуазеі вядуць надзвычайна жвавую прапаганду за дыктатуру, ня гледзячы на тое, што сацыял-дэмакраты ў якасьці партыі, якая ўдзельнічае ва ўрадзе, становіцца пабочна замешанай у гэтай прапагандзе, буржуазея патрабуе ад сацыял-дэмакратыі доказу яе энэргіі і таго, што „ёй можа давярыць».

Сацыял-дэмакратыя павінна паказаць, што можа задаволіць патрэбу ў фашызьме і дыктатуры. Па думцы кіраўнічых камуністычных колаў менавіта ў гэтым сэнсе належыць разглядаць мерапрыёмствы Гржэзінскага.

Апрача таго, прычынай, якая выклікала загад Гржэзінскага, зьяўляецца выключна моцнае разьвіцьцё працэсу радыкалізацыі рабочых мас і значныя посьпехі кампартыі за апошнія тыдні.

Агітацыя кампартыі, накіраваная супроць захаваньня ў моцы забароны дэманстрацыі 1-га мая, выклікала жывы водгук у рабочых колах. Улада прытрымліваецца таго пункту гледжаньня, што кампартыя не адступіць і што ня гледзячы на забарону закліку да ўдзелу ў дэманстрацыі 1-га мая знойдзе самы шырокі водгук.

Загад Гржэзінскага мае на мэце па магчымасьці запалохаць кампартыю і адначасна падрыхтаваць надзвычайна вострыя мерапрыёмствы для таго, каб перашкодзіць дальнейшаму рэвалюцыянізіраваньню рабочых мас. Кіраўнічыя камуністычныя колы надаюць загаду Гржэзінскага таксама і замежна-палітычнае значэньне, ацэньваючы яго, як адбітак узмацненьня імпэрыялістычных імкненьняў нямецкае буржуазеі і сацыял-дэмакратыі, для ажыцьцяўленьня якіх неабходна прыдушыць рух рабочых.

Новыя перамогі левых у нямецкіх фабзавкомах.

БЭРЛІН, 25-3. Апошнія весткі аб ходзе перавыбараў фабзавкомаў сьведчаць аб новых перамогах рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў на прадпрыёмствах фізычнага трэсту ў Грынгейме, на выбарах фабзавкому лейпцыгскага трамваю, на Крупаўскіх прадпрыёмствах у Эсэне.

ФРАНЦУСКАЯ БУРЖУАЗЕЯ ПРАВАКУЕ СУТЫЧКІ.

ПАРЫЖ, 25-3. «Юманітэ» падае наступныя падрабязнасьці наскоку паліцыі на канфэрэнцыю ФКП у Клішы: «ля ўваходу ў памяшканьне муніцыпальнае школы, дзе адбывалася заключнае пасяджэньне партыйнай канфэрэнцыі, знаходзілася 15 паліцэйскіх агентаў у цывільным убраньні. Гэтыя агенты патрабавалі ад уваходзячых дэлегатаў і гасьцей прадпаўленьня дакумантаў і рабілі на іх адрасу абражаючыя заўвагі в выразным намерам выклікаць сутычку.

Арышт аднаго з дэлегатаў выклікаў сутычку, у выніку якой камуністам удалося адбіць арыштаванага, ня гледзячы на тое, што агентаў падтрымалі паліцэйскія ў форме. Насупроць паведамленьню прафектуры ніхто з агентаў не пацярпеў. Дэлегаты вярнуліся ў залю, дзе пасяджэньне дажэй вялося пры зачыненых дзьвярох.

Па выкліку страдаў на месца сутычкі прыбылі 5 панцырных грузавікоў, пераапоўненых паліцэйскімі, якія абкружылі памяшканьне. Дэлегаты канфэрэнцыі прыпынілі пасяджэньне і пачалі выходзіць з залі. Паліцэйскія пачалі іх арыштоўваць на чарзе. Уварваўшыяся ў залю агенты арыштавалі прысутнічаючых і захапілі ўсе пападаўшыя пад руку дакументы і паперы. Арыштаваныя, у тым ліку дэлегаты і тэхнічныя супрацоўнікі, рэпарцёры камуністычных газэт (усяго 120 чал.) былі да вечара затрыманы ў паліцэйскіх вучастках. Некаторыя дэлегаты былі моцна пабітыя. Вельмі пацярпелі таксама чужаземныя рабочыя.

Сярод затрыманых—20 чалавек пераважна чужаземцы пакінуты пад вартай. Муніцыпалітэт Клішы заявіў пратэст супроць парушэньня муніцыпальных правоў».

Кансэрватары церпяць паражэньне.

ЛЁНДАН, 25-3. Перамога лібэралаў на дадатковых выбарах у Эдзіне і Гладлікольфіры аказалі кепскі ўплыў на пазіцыю друку газэтнага трэсту лёрда Ротэрміра.

Газэты гэтага трэсту схіляюцца цяпер у карысьць падтрыманьня лібэралаў, прынамсі ў карысьць прадвыбарнае згоды паміж кансэрватарамі і лібэраламі.

У палітычных колах лічаць, што лібэральная партыя ня пойдзе, аднак, на саюз з кансэрватарамі, ведаючы, што ў гэтым выпадку яна страціла-б вельмі многа выбаршчыкаў.

ГАНЬБА ЗДРАДНІКУ ПРАЛЕТАРСКАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

ПРАЦОЎНЫЯ МЕНСКУ—СУПРОЦЬ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ ТРОЦКАГА.

Троцкі скаціўся ў багну контр-рэвалюцыі

Пазнаёміўшыся з матар'ялам газэты «Правда» і заслухаўшы інфармацыю аб першых кроках Троцкага за межамі,—рабочыя і служачыя заводу «Дрэвапрапаванчік» ганьбяць яго выступленьне ў буржуазных газэтах з паклёпніцкімі артыкуламі супроць дыктатуры пралетарыяту ў ССР і УсеКП(б).

Контр-рэвалюцыйная дзейнасьць Троцкага за межамі паказала рабочай клясе ўсяго сьвету, што Троцкі канчаткова скаціўся ў лагер контр-рэвалюцыі і здрадзіў справе рабочае клясы і міжнароднае рэвалюцыі.

Мы, рабочыя, ухваляем усе мерапрыёмствы Савецкае ўлады ў адносіне да контр-рэвалюцыйных груп трацкістаў і да самога Троцкага.

Мы патрабуем і ў далейшым прымаць рашучыя меры адносна ўсіх тых, якія робяць спробу захіснуць дыктатуру пралетарыяту і перашкодзіць нам у нашым сацыялістычным будаўніцтве.

На здраду мінтэра Троцкага справе пралетарскае рэвалюцыі мы, рабочыя, адкажам яшчэ большай згуртаванасьцю сваіх шэрагаў вакол свайго вернага кіраўніка УсеКП(б). Яшчэ больш напружым свае сілы на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве УсеКП(б), верны кіраўнік рабочае клясы!

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Прэч лёкая буржуазеі.

Агульны сход рабочых фабрыкі Меншэвою другой зьмены з абурэньнем адзначае контр-рэвалюцыйную дзейнасьць замежамі мінтэра Троцкага. Троцкі дэзэртыраваў ад рэвалюцыі, здрадзіў інтарэсам рабочае клясы.

Разам з усей рабочай клясай нашага Савецкага Саюзу і ўсімі сьвядомымі рабочымі ўсяго сьвету рабочыя Меншэвою заяўляюць:

— Няма месца ў нашых шэрагах здрадніку сацыялізму і лёкаю буржуазеі. Прэч з нашых шэрагаў дэзэртыраў і здраднікаў, рэнегатаў і памоцнікаў контр-рэвалюцыі.

Першыя крокі Троцкага замежамі сарвалі з яго маску і паказалі сапраўдную яго ганьбасьць.

Тыя, каго ён левай фразай зьбіў з толку і зрабіў сваімі прыхільнікамі, зараз ясна зразумелі, чым зьяўляецца Троцкі.

Гатую левую фразу ён зьмяніў зараз напёткі аб СССР і буржуазныя даляры: ён прадаў свае сумленьне за дзесяткі тысяч даляраў, ён прадаў рэвалюцыйную справу.

На прыкладзе Троцкага мы бачым, куды ў сваім разьвіцьці вядзе ўсялякі ўхіл ад бальшавіцкай, ленінскай лініі. Пачаўшы з „рэвалюцыйных" паправак да палітыкі партыі ў вёсцы і ў галіне разьвіцьця індустрыі, пачаўшы з лёгкіх намёкаў на бюракратычнае перараджэньне партыйнага апарату, парушэньне і зажым унутрыпартыйнай дэмакратыі і г. д.,—Троцкі супроць заставіў ленінскай партыі сваю апартуністычную плятформу высунуў антысавецкія лёзунгі, якія заклікаюць да арганізацыі стачак і антаемнага галасаваньня і скончыў ганебным суарацоўніцтвам у буржуазнай прэсе.

Ганьба здрадніку Троцкаму! Сорам усім яго аднадумцам.

Яшчэ мацней згуртуемся вакол партыі Леніна.

Агульны сход рабочых і служачых аб'яднаных прадпрыёмстваў Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, заслухаўшы паведамленьне аб контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці Троцкага за межамі, заявяе:

— Троцкі перайшоў канчаткова ў лагер капіталізму і сваімі паклёпамі на краіну саветаў ператварыўся ў падрыхтоўцы нападу на рабочых і селян Савецкага Саюзу.

Нахай гэты вёс буржуазеі памятуе, што за гэта яму прыдзецца адказаць перад рабочай клясай усяго сьвету.

Ганьба здрадніку рабочай клясы.

У адказ на контр-рэвалюцыйныя выступленьні Троцкага мы, рабочыя і служачыя яшчэ моцней згуртуемся вакол нашага правадыра—партыі Леніна.

У Саюзных Рэспубліках.

ПРАВІЛЫ ПЕРАСЯЛЕНЬНЯ Ў СІБІР.

МАСКВА, 25-3. 25-га сакавіка ПК Працы выдаў інструкцыю аб парадку перасяленьня ў Далёкаўсходні край саматужнікаў, рамесьнікаў, асоб, якія займаюцца здабываючымі промыслами і беспрацоўных прамысловых рабочых Украіны і Беларусі.

Далёкаўсходнія краёвыя органы абавязаны не пазьней 1-га ліпеня падаваць свае заяўкі ў Усесаюзны перасяленцкі камітэт з зазначэньнем колькасьці патрабуемых асоб для райёнаў мяркуемага засяленьня.

Наркамзем Украіны і Беларусі павінны разьмеркаваць гэтыя заяўкі не пазьней 15-га сьнежня і падаць разьвёрстку Усесаюзнаму перасяленцкаму камітэту.

Асобы, якія жадаюць перасяліцца, павінны не пазьней 15-га студзеня падаць заяўкі ў мясцовыя зямельныя органы. У першую чаргу будуць задавальняцца заявы найбольш адчуваючых патрэбу і прамысловых каапэратываў. Усім залічаемым на вучастку будуць выдавацца перасяленцкія пасьведчаньні з правам праезду на льготнаму перасяленцкаму тарыфу. Усе ходакі павінны наміроўвацца ў Хабараўскі, Благавешчанскі, Уладывастокскі, Сроценскі, ці Чыцінскі перасяленцкія пункты. Далёка-крайсавэт, Далёкарыбаксаюз абавязаны дастаўляць каапэраваным сяматужнікам перасяленым на Далёкі Усход сродкі вытворчасьці-сыравіну, паўфабрыкаты. Перасяленчымся-прамысловымі каапэратывамі выдаюцца пазыкі, рамесьніцкае прамысловае абсталяваньне і дадатковыя крэдыты Усекабанку. Беспрацоўныя прамысловыя рабочыя, зарэгістраваныя на біржы працы, могуць перасяляцца толькі ў тым выпадку, калі жадаюць заняцца на Далёкім Усходзе сельскай гаспадаркай.

На дапамогу грамадзкай запашцы.

Народны Камісар Земляробства тав. Кубяк прапанаваў мясцовым зямельным органам ужыць усе захады да поўнага забясьпечаньня камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі зямельнымі ўгодзьдзямі для грамадзкае запашкі. Пры адводзе зямлі камітэтам сялянскае ўзаемадапамогі павінны дапасоўвацца да бяднацкіх калектываў; ім павінны адводзіцца лепшыя і найбольш выгадныя землі, прычым трэба прадугледжваць магчымасьць умацаваньня і пашырэньня грамадзкіх запашак камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі.

Паход трактараў.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 25-3. Дняпрасаюз арганізаваў да вясеньняга севу трактарную калёну ў 20 трактараў. Першая частка калёны ў складзе 10 трактараў ужо вышла ў паход і прыбыла ў Бліжняцоўскі райён.

МАСАВЫЯ АБУРЭНЬНЕ РАБОЧЫХ СУПРОЦЬ ВЫСТУПЛЕНЬНЯЎ ТРОЦКАГА.

ХАРКАЎ, 26-3. З розных месцаў Украіны паступаюць водгукі рабочых на выступленьні Троцкага ў ангельскай і амэрыканскай буржуазнай прэсе.

У Луганску адчыненыя партыйныя сходы на прадпрыёмствах аднагалосна адабраюць высылку Троцкага за граніцу і кляймяць ганьбаю яго рэнегацкую дзейнасьць. Кіеўскія рабочыя першае друкарні адабраюць меры партыі ў адносіне трацкісцкае апазіцыі і вітаюць высылку Троцкага за межы СССР.

У Адэсе агульны сход рабочых цукровага заводу імя Благаёва ганьбіць здраду Троцкага. Сход рабочых адэскае электрастанцыі адаслаў гамбурскім рабочым калектыўны ліст, у якім абвяргаюць паклёп Троцкага на краіну саветаў і паведамляюць аб дасягненьнях савецкага ўраду за 11 год існаваньня савецкай улады.

У Мікалаеве на ўсіх цэхах заводу імя Марці адбыліся сходы рабочых, якія заяўляюць: «На паклёп Троцкага мы адкажам узмацненьнем вытворчае дысцыпліны і зьніжэньнем сабекошту прадукцыі, каб перамагчы тыя цяжкасьці, якія стаяць перад краінай». Рабочыя аднадушна выказаліся за ўжыцьцё супроць трацкістаў самых рашучых мер.

РАШУЧАЯ БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ ШКОДНІКАЎ ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

АДЭСА, 26-3. У горадзе разгарнулася шырокая грамадзкая кампанія барацьбы супроць парушэньняў працоўнае дысцыпліны. Пракуратура ў тэрміновым парадку скончыла сьледзтва па 3-х справах, выкрываючых дрэнныя адносіны некаторых рабочых да варштатаў, вытворчае шкодніцтва і сымуляцыю.

На суконнай фабрыцы імя Сталіна за апошні час назіраюцца больш частыя выпадкі прастою машын з прычыны сапсаваньня варштатаў. Гэта выклікала падазрэньне ў намераным шкодніцтве. Некаторыя рабочыя знаходзілі ў варштатах цьвікі, якія затрымлівалі ход машын, канаты і пасы былі папсаваны. Сьледзтва выявіла, што рабочыя Айцут і Ціхоцкі сыстэматычна займаліся псаваньнем варштатаў, каб выклікаць прастой.

Айцут і Ціхоцкі ўгаварвалі многіх рабочых скараціць выпрацоўку нітак у два разы і наогул менш працаваць. У бліжэйшыя дні адбудзецца паказальны працэс над шкоднікамі. Рабочыя заводу, абураныя гэтым шкодніцтвам, вылучылі грамадзкага абвінаваўцу. Пракуратура прыцягнут да адказнасьці таксама рабочы фальсоўчых заводу Рудмэталгандлю Гладун, які ў працягу двох год займаўся сымуляцыяй і шкодніцтвам. Гладун, аддаваючы сам сабе ногі і рукі, у працягу трох месяцаў атрымаў з страхкасы 400 руб.

Гэтымі днямі адбудзецца паказальны працэс на справе групы міліцыянераў і пажарных лесапільнага заводу «Лесаэкспарт», якія кінуўшы працу без дагляду палаўзілі п'яную і ў п'яным выглядзе адмовіліся пусьціць рабочых на завод.

ПАСЫЛКА ПРАЦАЎНІКОЎ НА ВЁСКУ.

МАСКВА, 25-3. ЦК УсеКП(б) пастанавіў накіраваць 90 проц. усіх аканчваючых у 1929 г. камвузы і курсы павятовых партыйных працаўнікоў на партпрацу ў сельскія райёны найбольш важных хлебазагатоўчых і сыравінных округ. Арграспрэду і АППА ЦК даручана ўстанавіць плян разьмеркаваньня па арганізацыях скончыўшых Саратаўскі, Урала-Сібірскі, Сярэдня-азіяцкі, Татарскі і Паўночна-Каўкаскі Камуністычны унівэрсытэт. З складу канчаючых Сьвярдлоўскі і Ленінградскі Камуністычны унівэрсытэты 25 чалавек павінны быць вылучаны для працы ў працгрупах ЦК. Усе канчаючыя Кам. унівэрсытэты працоўныя Усходу і Камуністычныя унівэрсытэты нацыянальных меншасьцяй Захаду накіроўваюцца для працы ў нацыянальных райёны. Апрача таго ЦК даручыў Аграрспрэду распрацаваць і падаць на зацьвярджэньне ЦК праект мабілізацыі адказных працаўнікоў для працы ў сельскіх райёнах найбольш важных хлебазагатоўчых і сыравінных округ.

Абсьледаваньне стану каапэрацыйных цэн.

Цэнтральная камісія па барацьбе з павышэньнем розьнічных цэн, пастанавіла прапанаваць усім каапэрацыйным цэнтрам саюзных рэспублік неадкладна распачаць абсьледаваньне стану розьнічных цэн на мясцох.

У Саюзных рэспубліках, апрача РСФСР, павінна быць абсьледавана не менш 5 райёнаў у кожнай рэспубліцы. Вынікі абсьледаваньня павінны быць паведамлены цэнтральнай камісіі не пазьней 25 красавіка.

Выпярэдніцтва рабочых Масквы і Паволожжа.

Па ініцыятыве рэдакцыі «Рабочай Масквы» 11 найбольш буйных маскоўскіх заводаў і фабрык („Серп і Молот", завод ГЭТ, Падольскі і інш.) арганізуюць пераклічку-выпярэдніцтва з сялянамі Сярэдняга Паволожжа. Прычынаю да гэтага выпярэдніцтва паслужыла правядзімая МСПО кантрактацыя пасеваў у Сярэдня-Волскай вобласьці. Асноўны лёзунг пераклічкі—умацаваньне палітычнае і вытворчае сяброўскі паміж рабочымі буйнейшага прамысловага райёну і сялянамі Паволожжа.

Буйныя посьпехі азнафты.

БАКУ, 25-3. Акадэмік Фэрсман, які стаіць на чале камісіі Акадэміі Навук, прыбыўшай у Баку для высьветленьня пытаньняў, зьвязаных з разьвіцьцём хімічнае прамысловасьці Саюзу, у гутарцы па пытаньню аб выніках пабыту камісіі ў Баку падкрэсьліў значэньне вялізных залежаў ёду. Павідамляючы аб выніках азнаямленьня камісіі з асноўнымі момантамі гаспадаркі Азнафты, Фэрсман заявіў: «Да гэтае пары мы ня можам забыць таго ўражаньня, якое зрабілі на нас вялізарныя дасягненьні Азнафты за кароткі тэрмін часу».

Новы элеватар.

НІКАЛАЕЎ, 23-3. У Нікалаеве будуецца элеватар ёмкасьцю ў 85 тысяч тон. Частка элеватара, разьлічаная на 40 тысяч тон, павінна быць скончана ў кастрычніку. Зусім пачакана для будаўнікоў элеватара, экспартхлеб узьняў пытаньне аб кансэрвацыі пабудовы на 1-2 гады. Кансэрвацыя выкліча парушэньне шэрагу дагавораў і бескарысныя выдаткі на утрыманьне канторы ў часе кансэрвацыйнага перыяду. Усё гэта дасьць ня менш 260 тысяч руб. страты. Акруговыя арганізацыі катэгарычна пратэстуюць супроць пастановы экспартхлебу і узьнялі хадайніцтва перад адпаведнымі органамі аб адмене гэтае пастановы.

Маленькі „канцлер" Гржэзінскі і нямецкі пралетарыят

Прускі міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Гржэзінскі зрабіў «запретное предупреждение» нямецкай рабочай клясе.

Пану Гржэзінскаму, а разам з ім і ўсяму кааліцыйнаму буржуазна-сацыял-дэмакратычнаму ўраду Нямеччыны робіцца не па сабе ад апошніх посьпехаў рэвалюцыйнага крыла нямецкага рабочага руху. Шырокае пранікненьне камуністаў у масавыя рабочыя арганізацыі, рост уплыву кампартыі сярод фабзавкомаў пагражаюць падарваць важнейшую апору буржуазеі—сацыял-дэмакратыю і яе ўплыў у рабочай клясе. Разам в тым яно б'е па ўсей палітыцы нямецкае буржуазеі, якая знаходзіцца зараз перад новай задачай—далейшага перакладаньня на плечы рабочай клясы новых цяжар, зьвязаных з адраджэньнем імпэрыялізму ў Нямеччыне.

І пан Гржэзінскі, атрымаўшы адпаведны загад аб буйнае буржуазеі, пускаецца ў паход супроць нямецкае рабочае клясы, імкнучыся пры дапамозе асаднага становішча і сыстэмы тэрору загнаць нямецкую кампартыю ў падполье і пазбавіць яе магчымасьці весьці адкрытую барацьбу за кіраўніцтва рабочай клясай і супроць наступу нямецкага капіталу. Натуральна, што злучаны націск буржуазеі і сацыял-дэмакратаў ня можа ня ўплываць рэвалюцыянізуючы на рабочую клясу, бо ён б'е па непасрэдных матар'яльных інтарэсах рабочых і ў дадатак да гэтага—ператварае іх эканамічныя арганізацыі, дзе яны спадзяюцца знайсьці абарону супроць наступу капіталу, у асабісты паліцэйскі вучастак. Таму сотні тысяч рабочых, яшчэ ўчора сьледаваўшых за лёзунгамі сацыял-дэмакратаў, сёньня пераходзяць на бок кампартыі.

Сучасныя выбары ў фабзавкомы прынесьлі вялізныя посьпехі камуністам.

Гэткія факты, як заваёва камуністамі фабзавкому берлінскага гарадзкога транспарту, бохунскіх сталялітных заводаў і дзесяткаў вугольных капальняў у Рурскім басэйне, сьведчаць аб вялізным руху ў шэрагах рабочае клясы. Яшчэ падаўна правадыры нямецкае кампартыі зазначалі, як на сваю слабасьць на той факт, што камуністы пачвалі на сярэдніх і дробных прадпрыёмствах. Выбары ў фабзавкомы паказваюць, што КП Нямеччыны шырокім фронтам пранікае цяпер на буйныя прадпрыёмствы.

Асноўны вывад в гэтага наступу пана Гржэзінскага той, што Нямеччына ўступае ў такі пэрыяд разьвіцьця капіталізму, калі нават у такой прамыслова

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

АБ УЗМАЦНЕНЬНІ РЭГАВАНЬНЯ НА КРЫТЫКУ Ў ДРУКУ І НАСЬЦЕНГАЗЭТАХ *).

Зробленая ЦКК НК РСІ Бел. сумесна з рэдакцыямі пасобных газэт, з прыцягненьнем рабкораў, праверка рэгаваньня на заметкі ў друку і насьценгазэтах паказвае, што, ня гледзячы на шэраг кіруючых дырэктыў аб абавязковым рэгаваньні на крытыку ў друку і на некаторае палепшэньне ў гэтым напрамку за апошнае паўгодзьдзе—справа гэта ў агульным пастаўлена яшчэ нездавальняюча.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б на падставе праверкі адзначае, што дзейственасьці самакрытыкі ў друку яшчэ да гэтага часу перашкаджае бюракратычнае супраціўленьне дзяржапарату і няўважлівыя адносіны да запатрабаваньняў мас з боку пасобных праф. і парт. органаў ячэек, што знаходзіць адбітак у такіх праявах бюракратычных адносін да самакрытыкі ў друку, як цягаціва і надзвычайная працягласьць расьсьледваньняў заметак, нездавальняючая якасьць адказаў—замест абгрунтованых адказаў і водгукаў на заметкі—ва многіх выпадках наглядаюцца фармальныя, бюракратычныя адпіскі «абвяргаеньні» і досыць часта—зьвяшчы поўнага ігнараваньня заметак у друку.

У мэтах узмацненьня дзейственасьці крытыкі ў друку ўстанавіць:

1. Асноўнымі органамі на мясцох, якія павінны ўсямерна садзейнічаць своечасоваму і дзелавому рэгаваньню на заметкі ў друкаваных і насьценных газэтах—зьяўляюцца фабзавмясцкомы і партячэйкі.

На буйных прадпрыёмствах і ва ўстановах лічыць мэтазгодным арганізацыю адведна пастановам 4-й уссаюзнай нарады рабселькораў (лістапад—сьнежань 1928 г.) спэцыяльных бюро дасягненьняў пры рэдкалегіях насьценгазэт, задача якіх—забясьпечыць дзейственасьць рабселькораўскіх заметак у насьценгазэтах. Бюро дасягненьняў павінна складацца з прадстаўнікоў рэдкалегіі, рабкораў, раб. засяседаля бюро скаргаў РСІ ці члена гарсавету, фабзавмясцкому, партячэйкі, а таксама прадстаўніка адміністрацыі. Асноўная праца бюро—гэта наладжваньне расьсьледваньняў і праверка выкананьня прапаноў як па заметках у насьценгазэтах, так і па заметках у друкаваных газэтах, якія датычаць данага прадпрыёмства ці ўстановы, а таксама вядзеньне вучоту дзейственасьці заметак і асьвятленьне ў друку вынікаў заметак. Да працы па расьсьледваньні заметак бюро дасягненьняў прыцягваюць рабкораў, нізавы парт. і праф. актыў дэпутатаў саветаў, дэлегатак, «лёгкую кавалерыю» і інш.

Расьсьледваньні, якія патрабуюць умяшаньня органаў РСІ ці пракуратуры,—перадаюцца апошнім бюро дасягненьняў непасрэдна (падрабязнае палажэньне аб бюро дасягненьняў апублікавана ў пастановах 4-й уссаюзнай нарады рабселькораў—лістапад сьнежань 1928 г.).

2. Побач з гэтым абавязаць адміністрацыю ўстанавіць сталы нагляд за заметкамі ў мясцовых і цэнтральных газэтах і весьці спэцыяльны вучот гэтым заметкам, каму, на які тэрмін даручана расьсьледваньне, ці дача адказу на заметкі і што фактычна па ёй праведзена ў жыцьцё.

Кіраўніком прадпрыёмстваў і ўстановаў неабходна даваць на заметкі зусім праверэныя адказы, у суадносных выпадках рабіць жывую праверку фактаў і, толькі грунтуючыся на гэткіх даных, даваць пісьмовыя адказы ў газэту (пасылка адказаў—пісьмовых—у рэдакцыі газэт бязумоўна, абавязкова). Паказаць кіраўніком, што даручэньні па расьсьледваньні заметак павінны даваць толькі зусім праверэным на працы працаўніком, пры гэтым катэгарычна забараніць дачу такіх даручэньняў вымываемым (разаблачаемым) у заметцы працаўніком.

У працы па расьсьледваньні заметак і дачы адказаў на іх павінна быць устаноўлена ўвязка паміж адміністрацыяй і бюро дасягненьняў ці іншымі нізавымі расьсьледваньскімі камісіямі.

3. Лічыць, што няўважлівыя адносіны да рэгаваньня на рабселькораўскія заметкі і дача на іх безпадстаўных абвяржэньняў павінны разглядацца, як найвярнейшая адзнака загніваньня апарату, бо гэта паказвае, што ў даным апараце бюракратычныя жажэньні прыдушаць сабою ініцыятыву ў галіне зьвяшчэньня недахопаў;

а) выходзячы з гэтага неабходна ва ўсіх выпадках сыстэматычнага ігнараваньня рабселькораўскіх заметак ці «абвяргаеньня» прыцягваць да суловай адказнасьці, як за злачынства, вінаватых у ігнараваньні і фармальных і бюракратычных адносінах да крытыкі ў друку;

б) таксама трэба расцэньваць, як бюракратычнае супраціўленьне крытыцы ў друку і заслугоўваючымі суровых мер пакараньня, эж да прыцягненьня да суловай адказнасьці—наглядаючыяся факты адказаў на заметкі, якія абмежаваны адным толькі канстатаваньнем ці пакідамленьнем аб выніках расьсьледваньня бяз прыняцьця сапраўдных мер па хутчэйшым зьвяшчэньні ненармальнасьцяў, адзначаных у заметках;

в) прызнаць мэтазгодным у бліжэйшы час правесьці некалькі судовых паказальных працэсаў на прадпрыёмствах і ва ўстановах адносна няправільных, злосных, бюракратычных абвяржэньняў на заметкі і прапановы рабочых (у тым выпадку, калі будзе ўстаноўлена бясспрачнасьць няўгрунтаванасьці адказу);

г) у тых выпадках, калі ўстанаўляецца асабістая віноўнасьць у дачы няправільных адказаў, ні цеганіны з дачай адказаў з боку асобных працаўнікоў апарату—адміністратары павінны ўжываць да іх адміністрацыйныя спагнаньні, паведаміўшы аб гэтым праз газэту і загады.

4. Абавязаць усіх кіраўнікоў устаноў і прадпрыёмстваў прыняць рашучыя меры да больш хуткага расьсьледваньня і пасылкі адказаў на рабселькораўскія заметкі ва ўсякім выпадку.

а) па заметках, якія патрабуюць мерапрыёмстваў адміністрацыйным парадку, даваць адказ на працягу ня больш тыдню з моманту зьмяшчэньня ці атрыманьня заметкі;

б) па заметках, патрабуючых расьсьледваньня на мясцох (па пэрыферыі), таксама даваць больш хуткія адказы, ва ўсякім выпадку на працягу ня больш 2-3 тыдняў.

У гэтых мэтах цэнтральным і акруговым установам трэба як мага скарачаць колькасьць перадатачных інстанцый, а ў больш важных выпадках—рабіць жывое расьсьледваньне.

5. Прызнаць абсалютна непарушымымі няўважлівыя, пасыўныя адносіны нізавых парт. і праф. органаў да газэтных заметак, а таксама недапушчальную бязьдзейнасьць нізавых органаў да фактаў бюракратычных адносін адміністратараў да газэтных заметак, асабліва ў адносінах да тых заметак, дзе закранаюцца пытаньні данага прадпрыёмства ці ўстановы:

а) нізавыя органы павінны актыўна ўмяшацца ў справу рэгаваньня на газэтныя заметкі, падштурхоўваючы адміністрацыю да хуткага сапраўднага зьвяшчэньня крытыкуемых недахопаў і дачы грунтоўных адказаў, а таксама абгаворваючы на сваіх пасяджэньнях даваемыя ў газэту пасобныя адказы з цугненьнем у гэтую справу нізавых масавых органаў, даючы гэткім чынам дадатны прыклад уважлівага і хуткага рэгаваньня на крытыку ў друку;

б) нізавыя парт. і праф. органы павінны першымі—як самастойна, так і праз органы КК-РСІ, пракуратуры, суду і г. д.—праяўляць ініцыятыву ва ўзбуджэньні справу аб прыцягненьні да адказнасьці вінаватых у бюракратычных адносінах да самакрытыкі. Няпрыняцьце нізавымі органамі мер у гэтым напрамку павінна разглядацца, як невыкананьне дырэктыў партыі аб самакрытыцы;

в) партячэйкі павінны ўлічваць прапановы і факты з заметак у сваёй бягучай дзейнасьці ў сэнсе скарыстаньня іх у працы і намяшчэньня такіх мерапрыёмстваў, якія зьвяшчалі-б вынікі выкрытых недахопаў і выпраўлялі ўсю сыстэму працы прадпрыёмства ці ўстановы.

6. Апрача ўсіх вышэйказаных прапаноў,—асобна ў адносінах да насьценгазэт, улічваючы іх вялізнае значэньне на прадпрыёмствах (асабліва друкаваных) і ва ўстановах—прызнаць неабходным:

а) зьвярнуць увагу партячэек і фабзавкомаў на неабходнасьць значнага павышэньня агульнага кіраваньня з іх боку працай рэдкалегій насьценгазэт шляхам перыядычнага заслухоўваньня дакладаў рэдкалегій, вынесеньня гэткіх дакладаў для абгаварэньня на парт. сходах і шырокіх рабочых сходах. Асабліва важна дабіцца, каб парт. ячэйкі і фабзавмясцкомы дапамагалі рэдкалегіям у справе своечасовага рэгаваньня на заметкі з боку адміністрацыі;

б) парткомам і нізавым парт. і праф. ячэйкам павесьці рашучую барацьбу з хуліганскімі адносінамі да насьценгазэт, зрывам цельных нумароў выкрываючага характару, ці асобных рэзкіх заметак, карыкатур, псаваньня такіх заметак рознымі недапушчальнымі надпісамі і г. д. Ва ўсіх такіх выпадках трэба ставіць грамадзкую думку рабочых і служачых у сэнсе рашучага асуджэньня гэткіх зьявішч і прыцягваць вінаватых да строгай судовай адказнасьці;

в) рэдкалегіі павінны больш настойліва і рашуча дабівацца рэальных вынікаў на заметках, ня спыняючыся ў патрэбных выпадках перад зваротваньнем у вышэйшыя органы—КК-РСІ, партком, пракуратуру і г. д.;

г) рэдкалегіям неабходна ўстанавіць сталыя куткі ў газэтах,—дзе зьмяшчаць адказы адміністрацыі і водгукі на заметкі, што будзе заахвочваць да большага ўдзелу мас у працы насьценгазэт;

д) рэдкалегіям трэба ўстанавіць шчыльную сувязь з рэдакцыямі друкаваных газэт. З боку апошніх рэдкалегіям павінна аказвацца рэгулярная інструкцыйная дапамога, садзейнічаньне ў арганізацыі і разгортваньні працы з рабселькорамі;

е) таксама рэдкалегіям трэба ўстанавіць сувязь з судова-сьледчымі органамі і пракуратурай шляхам перадачы матар'ялаў выкрываючага характару, патрабуючага рэгаваньня ў судовым парадку.

Абавязаць усіх кіраўнікоў прадпрыёмстваў і ўстаноў, парт., праф. і грамадзкіх органаў як цэнтральных і акруговых, так асабліва ў райёнах—прыняць адпаведныя меры, якія-б забясьпечылі правядзеньне ў жыцьцё (у сваіх установах) гэтых прапаноў ЦКК-НК РСІ па рэгаваньні на заметкі ў друку і насьценгазэтах.

Старшыня ЦКК і Нарком РСІ Бел. КАЛІН.

*) Пастанова друкуецца ў скарочаным выглядзе. Поўны тэкст прадугледжвае таксама дырэктывы па палепшэньні пастановаў і расьсьледваньня газэтных заметак як у радкасных газэт, так і па лініі судова-сьледчых органаў і ў АКК-РСІ, а таксама аб сувязі органаў КК-РСІ з насьценгазэтамі.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР.

НАЗНАЧЭНЬНЕ Т. БАРАШКІ.

Кандыдат у члены прэзыдыуму ЦВК БССР т. Барашка назначан членам камісіі Прыватных Амністый пры прэзыдыуме ЦВК БССР.

НОВЫ СТАРШЫНЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ КАСАЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ.

Прэзыдыум ЦВК БССР назначыў старшынёй Грамадзянскай Касацыйнай Калегіі Штайера Сьцяпана Сьцяпанавіча замест т. Зыбко, і які прызначан старшынёй Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю па земельных справах пры Наркамземе БССР.

Т.Т. АСТРОЎСКІ І ГІНЗБУРГ—ЧЛЕНЫ ВЯРХОЎНАГА СУДУ.

Членамі Вярхоўнага Суду БССР назначаны Астроўскі Канстантын Васільевіч і Гінзбург Уладзімер Рыгоравіч.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Абураючы выпадак.

(Па тэлеграфу).

МАЗЫР, 26-3. У вёсцы Хамічах, Мазырскай акругі кулакі-хуліганы напалі на бедняка селяніна Яўтушэнку і моцна яго зьбілі за тое, што ён агітаваў і галасаваў на сходзе сялян за самаабкладаньне.

ШКОЛЫ НА ФРОНЦЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Магілеў, 26-III. Вяліка-Літоўская і Мала-Ліпаўскія школы маюць прабу лічыцца ўзорнымі па той працы, якую яны вядуць па перабудове сельскае гаспадаркі.

Некаторыя гаспадаркі завялі ў сябе вучот. Гэта—пад уплывам вучняў, якія ў школе даведаліся, што такое плян і вучот у сельскай гаспадарцы.

Пры школьных чырвоных куткох працуюць сельска-гаспадарчыя гурткі, адкуль сялянства бярэ веды па сельскай гаспадарцы: гурткі маюць кніжкі, выпісваюцца часопісі.

Школы прынялі ўдзел у бягучай пасеўкампаніі. Растлумачана пастанова ўраду аб падвышэньні ўраджайнасьці і новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку. Дзякуючы школе, сяляне будуць сеяць адсартаваным насеньнем. Вучні праводзяць праверку насеньня на ўходжасьць.

У мінулым годзе праароблена выпіска рознага насеньня (карняплодаў і інш.), сёлета маркуецца выпісаць насеньня 120 пудоў.

Школа шэфствуе над 6 гаспадаркамі, у якіх уводзяцца розныя культурныя палепшаньні.

Павінна быць адзначана праца на калектывізацыі. Як дарослыя, гэтак і вучні ведаюць, што такое камуна, арцель. Зацьверджаны статуты: у М. Ліпаўцы—арцелі, у В. Ліпаўцы—камуны. Падрыхтавана глеба для пераходу на калгасны статут усяе вёскі. Трэба, каб райённыя працаўнікі выехалі ў вёску, працягнулі-б настаўніцкую працу, далі-б розныя практычныя растлумачэньні, узялі на сябе арганізацыю новага вялікага калгасу. **Квік.**

Ахвяра касы ашчаднасьці.

Як і ўсюды, у Высачанскім раёне ў лютым месяцы быў абвешчан двухтыдневік кас ашчаднасьці. Мабілізаваліся саюзы, пашла праца. Машыністка РВК т. Цярэнцьева пашла ў крэдытнае таварыства для ўцягненьня ўкладчыкаў у касу ашчаднасьці.

Але не пашанцавала беднай Цярэнцьевай. На яе бяду ў той час, калі яна ўжо пачала пісаць укладны лістоў, у памяшканьне праўленьня зайшоў член праўленьня таварыства т. Мядзьведзяў і, пачуўшы агітацыю за вярбоўку ўкладаў, вельмі абурыўся. Як, чаму, на якой падставе і ў памяшканьні крэдытнага таварыства праводзіцца вярбоўка ўкладчыкаў кас ашчаднасьці, калі такія-ж уклады прымаюцца і таварыствам. Закрычаў ён на машыністку і прапанаваў ёй пакінуць памяшканьне.

Здавалася, што на гэтым будзе скончана, але пакрыўджаны Мядзьведзяў не супакоіўся і піша заяву ў суд аб прыцягненьні да адказнасьці Цярэнцьёвай за абразу «пры выкананьні службовых абавязкаў».

І вось тут з-за галавацяпства і бюракратызму і пашла гулянь валакітушка. Судзьдзя накіраваў заяву ў міліцыю, справавод, як і належыць, у папку «на даклад», начальнік міліцыі даручае расьсьледваць свайму памоцніку (сур'ёзная справа) і ў трох тэхнічных працаўнікоў-сьледак займаюць па 2 службовыя гадзіны на допыт. Перапіска для выкананьня допыту на райёне пападае да старшага міліцыянэра для допыту сьледак інцыдэнта-сялян.

Канец—нявіноўнасьць Цярэнцьевай і накіраваньне справы для спыненьня. Вось і агітуй пасьля гэтага за ашчаднасьць. **Нялюдзімы.**

2 царквы і 2 сынагогі—для культпатрэб.

Магілёў, 26-3. *На першы пленум Магілёўскага гарсавету зьявіліся рабочыя, чырвонаармейцы і саматужнікі, каб адстойваць свае запатрабаваньні аб перадачы для культурных патрэб будынкаў рэлігійных культаў. Гарсавет здаволіў запатрабаваньні працоўных, ухваліўшы перадаць будынкі 2 цэркваў і 2 сынагог, з якіх 1 царква («трохсвятительская») і 1 сынагога («Цукермана») маюць вельмі добрыя будынкі.*

Гвалтаўніка вычысьцілі.

Быхаў, 26-3. Правёўшы сход беднаты ў вёсцы Віляхоўцы, старшыня Тошчыцкага сяльсавецкага таварыства Вінаградаў, ён-жа сэкратар мясцовае парт'ячэйкі, накіраваўся ў кватэру мясцовае настаўніцы.

Вінаградаў пачаў прыставаць да настаўніцы з «ласкамі», але бяз посьпеху. Нарэшце, ён кінуўся на настаўніцу з намерам згвалціць; ахвяра змагалася, пачала крычаць «ратуйце».

Гаспадары хаты за сьценкаю прачнуліся, але баяліся зайсьці, бо чулі за сьцяною „маўчы—буду страляць", абмежаваліся тым, што захадзілі па хаце, чым і выратавалі настаўніцу.

Доктар—хуліган.

(г. Ворша).

У Аршанскай рабочай амбуляторыі ёсьць доктар Бродзкі. Гэты доктар яшчэ ніводнага дню ня абышоўся, каб з кім-небудзь з хворых не палаяцца. Як толькі Бродзкі бачыць, што сабралася шмат хворых на прыём, дык ён некалькі чалавек прыме, а апошніх добра палаяўшы прагоніць.

Бродзкі вылаяў рабочага Курэнера і ня прыняў яго, вылаяў і ня прыняў хворую супрацоўніцу АВК. Супрацоўніцу АВК зарэгістравалі і картку ўжо выдалі на рукі, як Бродзкі прыняўшы трох хворых адмовіў у прыёме, ня гледзячы на тое, што да канца прыёму заставалася яшчэ каля гадзіны.

За лаянкі, грубасьць застрахаваныя г. Ворша на справаздачным сходзе закрабавалі зьяніць доктара Бродзкага, але нічога пакуль што яшчэ нячутно. **Аршанец.**

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ВЕЧАР,

ПРЫСЬВЕЧАНЫ ЛІТАРАТУРНА-ТЭАТРАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ ГАЛУБКА.

Урачысты вечар, прысьвечаны літаратару і артысту Ўладыславу Язэпавічу Галубку з прычыны наданьня яму годнасьці народнага артысты, адчыняе Міхась Чарот.

У прэзыдыум запрашаюцца прадстаўнікі літаратурных аб'яднаньняў БелАПП'а, Узвышша, Нам. Наркамасьветы тав. Слонім і іншыя.

Пад воплескі ўсёй залі ў ганаровы прэзыдыум запрашаюцца т. т. Гамарнік, Васілевіч, Чарвякоў, Галадзед, Стасевіч, Ігнатоўскі.

З дакладам аб літаратурнай і тэатральнай дзейнасьці У. Я. Галубка выступіў пісьменьнік Цішка Гартны.

Першыя спробы ігры Галубка зьявіліся яшчэ ў 1908 годзе, у адзінай тады крыніцы беларускага друкаванага слова „Наша Ніва".

У пэрыяд з 1908 да 1915 году Галубок у „Нашай Ніве" зьмяшчае цэлы шэраг навэль, вершаў і гэтак далей. Асаблівай увагі з твораў таго часу заслугоўваюць навэлы «Навальніца» і вершы „Будучыня" і «Сяміяжнік». Галубка не здавальняе адно «пісаньне», ён становіцца драматургам і артыстам. Навакол сябе ён яднае рабочых чыгуначнікаў, у яго драматычны гурток ідуць друкары, настаўнікі і іншыя. Галубок пачынае займацца драматургіяй: ён піша п'есы для свайго драматычнага гуртка. Першыя п'есы, якія выйшлі з пад пяра Галубка—«Бязьбіная кроў», „Апошняе спатканьне» і «Пісарабы імяніны».

Трэба дзівіцца надзвычайнай энэргіі Галубка: увечары ён іграе ў спэктаклі, удзень урыўкамі піша свае драмы, п'есы. Тэатр Галубка працуе бяз ніякай дапамогі. Асабліва цяжка было працаваць Галубку ў час польскай акупацыі, пад канец якой ён едзе ў Слуцак, дзе арганізоўвае аматарскую трупу. Зразумела, польскім панам прыйшлося не па густу тэатральная праца Галубка, калі ў сваіх пастаноўках ён бічаваў гэтых паноў, і Галубку прыйшлося пакінуць Слуцак.

Толькі з прыходам савецкай улады Ўладыслаў Галубок прыбліжа ў пачатку 1921 году зноў арганізуе беларускую трупу.

З канца 1921 году Галубка пачынаюць ведаць у ваколіцах Менску. Яго пастаноўкамі захапляліся працоўныя масы, і трупа Галубка стала жаданым госьцем у кожным рабочым клюбе.

Бяз усялякае дапамогі 1921, 22 23 і 24 гады трупа Галубка аб'язджала шмат куткоў Савецкай Беларусі. Толькі з 1925 г. на Галубка пачынаюць зварочваць увагу, і Наркамасьветы даў трупе яго невялікую грашовую дапамогу. Разам з дапамогай Галубку даюць і заданьне паехаць абслужыць пастаноўкамі Мазырскую акругу і ён з гонарам выканаў гэтае заданьне.

З таго часу Наркамасьветы трупе Галубка надаў назву Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру.

Уся чынасьць Ул. Галубка за час з 1914 да 1928 г. зьяўляецца самаадданай працай на карысьць беларускай пралетарскай культуры і тэатру. Адданасьць Уладыслава Язэпавіча Галубка поўнасьцю ацэнена ўрадам БССР, які надаў яму ганаровае званьне народнага артыста.

У заключэньне Цішка Гартны выказвае ўпэўненасьць, што Галубок з яшчэ большай адданасьцю будзе весьці сваю вялікую працу і прынясе яшчэ многа карысьці беларускім працоўным гушчам.

Ад імя НКА БССР тав. Галубка вітае нам. Нар. Кам. Асьветы т. Слонім. Наданьне т. Галубку такога ганаровага званьня зьяўляецца падагуленьнем вялікай працы яго на карысьць беларускай тэатральнай справы. Трэба, кажа т. Слонім, мець надзвычайна вялікую бадзёрасьць, вялікае культурнае пачуцьцё, каб у пяжкія гады царызму будаваць асновы беларускай пралетарскай культуры. Тав. Слонім зачытвае і перадае Галубку грамату аб наданьні яму годнасьці народнага артыста.

Горача віталі народнага артыста прадстаўнікі літаратурных аб'яднаньняў «Полымя», «БелАПП'а», «Узвышша» прадстаўнікі таварыства беларускіх драматургаў і кампазытараў, Беларускай Дзяржаўнай капэлі і ад калектыву Бел. Дзярж. Вандроўнага Тэатру. „Полымя" прыпаднесла яму адрас.

Міхась Чарот зачытвае прывітальныя тэлеграмы Галубку ад Бел. Дзяржаўнага Ўкраінскага тэатру і ад дырэктара і рэжысэра гэтага тэатру.

Гучнаю авацыяй сустракае грамадзтва Галубка. У адказе на ўсе прывітаньні, ён зазначае, што наш маладняк-артысты расьлі і рабілі сваю вялікую справу на савецкіх дражджах. Я вельмі шчасьлівы, што змог прынесьці карысьць працоўным. У мяне, кажа Галубок, ня было больш шчаслівага моманту ў жыцьці, як той, калі пасьля пастаноўкі ў адной прымежнай вёсцы батракі перадалі мне лапці. Гэтыя лапці зрабілі рэвалюцыю тут, зробяць яны яе і там, за межамі. Мы верым, што наш тэатр будзе з часам працаваць у савецкай Вільні і ў савецкай Горадні, і я тады скажу працоўным, што я самы шчасьлівы чалавек.

* * *

Пасьля ўрачыстага пасяджэньня Вандроўным Тэатрам пры ўдзеле студэнтаў музтэхнікуму арганізавана была мастацкая частка. Вось троці акт п'есы Ул. Галубка „Плытагоны" едуць плытагоны, далёка чутна песьня, а вось і сватаньне... Усё больш і больш зьяўляецца дзеячых асоб. Артысты ўпэўнены, зусім свабодна трымаюць сябе на гэтай вялікай сцэне так як і ў вёсцы. Воплескі. Гэта зьявіўся плытнік Пацук—Галубок. Усё больш і больш захапляецца публіка і весела настройваецца гледзячы на камічныя моманты сватаньня гэроя п'есы.

У чацьвертым акце—вясельлі, тэатр поўнасьцю аўладаў гледачом. Тут ён паказаў дасканалую ігру актораў.

Музыка—скрыпка, цымбалы, бубен, гармонік, а таксама танцы сватоў і моладзі усё гэта дало гледачу надзвычайна яскравы, маляўнічы абразок вясковага вясельля.

Добрае ўраўнаньне робіць кляса народных інструмантаў музтэхнікуму пад кіраўніцтвам т. Захара. Аб гэтым часта пісалася. Хочацца толькі яшчэ раз дадаць, што патрэбна большая ўвага гэтай маладой цікавай і неабходнай арганізацыі. Пасьля выступленьня маладога скрыпача-студэнта музтэхнікуму і артыста В. Сэляха на сцэне зьявілася вядомае ўсім, усімі любімае музычнае трыо на чале з Галубком.

На гэты раз шырокую праграму даў хор тэатру пад кір. (т. Сакалоўскага у рэпэртуары асабліва шырокае мэсца займаюць гарманізаваныя народныя песьні, што зьяўляецца вельмі каштоўным. У заключэньне тэатр паказаў свой балет. „Лявеніха" выканана так цікава, як яна дагэтуль здаецца нідзе ніводным тэатрам ня выконвалася.

У чытача гэтага артыкулу можа стварыцца ўражаньне, што ў Вандроўным тэатры артыстых чалавек дзеяньнога.

А тут справа ў тым, што ў гэтым тэатры няма актора, які-б ня быў і сьпеваком, танцорам і нават музыкам. І прыходзіцца дзівіцца тэй надзвычайна вялікай энэргіі, з якою ўсе акторы на чале з Уладыславам Галубком выконваюць розныя абавязкі сцэны.

Вось чаму так шчыра, горача грамадзтва вітала стварыцеля гэтага тэатру Галубка і ўвесь яго тэатральны калектыў. **З. і С.**

ЗА УЗМАЦНЕНЬНЕ ПРАЦЫ СЯРОД РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ.

(НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ ПРАЦАЎНІКОЎ СЯРОД РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ).

23 сакавіка ў залі ЦСПСБ адчынілася ўсебеларуская нарада працаўнікоў сярод рабочай моладзі, скліканая ЦК ЛКСМ. У нарадзе прымаюць удзел 63 дэлегаты.

З дакладам аб працы прафсаюзаў сярод моладзі выступіў т. Розін. Даклад выклікаў надзвычайную актыўнасьць дэлегатаў. Выказалася ў спрэчках каля 30 дэлегатаў. Спрэчкі занялі пасяджэньні ў суботу і раніцяе—у нядзелю.

Аб чым-жа гаварылі дэлегаты?

На мясцох часта ў прафорганах нам гаворыць: вядзіце сваю працу сярод падросткаў і ня сунеце носа не ў сваю справу. Часам працаўнік сярод моладзі ставіць пытаньне аб неабходнасьці пры перавыбарах фабзавмясцкомаў на адказную пасаду ў апошнім высунуць прадстаўніка моладзі, а прафорганы кажуць, што гата мы абяцаць ня можам.

—З боку прафорганаў і клюбаў назіраюцца абы якія адносіны да моладзі. Трэба правесьці той ці іншы сход моладзі, а ў саюзе кажуць—дайце ім клюб на аўторак або на сераду. Між тым сход лепш за ўсё можна правесьці ў суботу ці ў нядзелю, а ў гэтыя дні нам ніколі клюбу не даюць,—кажа прадстаўнік саюзу друкароў.

Калдагаворная кампанія па саюзу друкароў у Менску прайшла добра. Але калі мы надумалі правесьці сход моладзі для абгаварэньня калдагавору, дык сэкратар ячэйкі сарваў абвестку і заявіў: «мы вам не дазволім асобна абгаварваць калдагавор».

Тав. Балярэўскі (Шклоў) указвае, што моладзь высоўвае такія прапановы ў калдагавор, што іх цяжка выканаць. Часта моладзь займаецца «болтовней».

Трэба паказаць, што мы можам рабіць, і тады фабзавкомы заўсёды пойдуць нам насустрэч. Юнсэкцыя працуе слаба і прафорганы не дапамагаюць ёй наладзіць працу.

Прадстаўнік Віцебску знаходзіць, што прафорганы вельмі мала зварочваюць увагі на працу сярод моладзі.

— У нас,—кажа ён,—на фабрыцы 1800 рабочых—ёсьць брыгада моладзі ў 100 чал. Між тым, прафарганізацыі і адміністрацыя зрываюць адчыненьня фабзавуча. Кажуць, што памяшканьне патрэбна для іншых мэтаў.

Тав. Чыжэўскі зазначае, што прафсаюзы амаль зусім не дапамагаюць у працы сярод моладзі, ды і ЦП саюзаў аказваюць малую дапамогу ў прафпрацы на мясцох.

Шэраг дэлегатаў скардзіліся на тое, што прафсаюзы дрэнна адносяцца да вылучэньня моладзі на прафэсыйную работу.

— Вы, кажуць нам прафорганы, нашы мала елі, каб вас высоўваць на кіруючую прафработу—гаворыць прадстаўнік Гомелю т. Левін.

Зазначалі дэлегаты і на тое, што часта брань-падросткі знаходзяцца толькі на чорнай рабоце, з прычыны чаго яны не набываюць кваліфікацыі і іх нельга разбрапіраваць.

Многія таварышы гаварылі аб тым, што на прадпрыёмствах кульгае працоўная дысцыпліна, назіраюцца прагулы, спазьненьні на работу, гутаркі ў часе работы і г. д.

Галоўнае зло ў падзеньні працоўнай дысцыпліны і прагулах—п'янства, з якім трэба павесьці самую рашучую барацьбу. Трэба пашырыць масавую культпрацу, шырэй уцягваць моладзь у фізкультурныя гурткі.

— Мы пастанавілі,—кажа прадстаўнік Менску,—арганізаваць на сваім прадпрыёмстве ўдарную брыгаду за падняцьце вытворчасьці, за падняцьце працоўнай дысцыпліны, але моладзі ў гэтым пытаньні пасустрэч не пашоў ні завком, ні адміністрацыя. Яны кажуць: узьнімайце дысцыпліну кожны паасобку, а брыгада не патрэбна.

У нядзелю быў заслуханы даклад т. Жылюка аб пэрспэктывах юнацкай працы і адукацыі рабочай моладзі ў сувязі з 5-хгадовым планам разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР.

ПОЛЬСКІ ФАШЫЗМ ЗА ПРАЦАЙ.

(Артыкул тав. Фэлікса Кона).

Абапіраючыся на абшарнікаў, на значную частку буржуазеі, на кулакоў, на дэклясаваны элемэнт дробнае буржуазеі, Пілсудзкі ўсёю сілаю дзяржаўнага апарату зваліўся на рабочую клясу, сялянства і нацыянальныя меншасьці, г. зн. на тыя элементы, якія ў выпадку вайны могуць перашкодзіць яго валўнічым плянам. Дзейнага памоцніка і дапаможніка ў прыдушэньні ўсякага руху гэтых «ворагаў існуючага ладу» ён знаходзіў і знаходзіць як і ўсе ўрады буржуазных краін— у II Інтэрнацыянале, прадстаўленым у Польшчы ППС. У Польшчы паўтараецца тое, што адбываецца і ў іншых буржуазных краінах. Па меры росту антаганізму сярод імпэрыялістаў, на меры росту цяжкасьцяй пры правядзеньні стабілізацыі, якая вядзе да ўзмацненьня капіталістычнае рэакцыі, прыгнечаньня і эксплёатацыі мас, так званая дэмакратычная буржуазея робіцца апораю фашызму, сама ператвараецца ў фашысцкую. Гэтым тлумачыцца тое, што дыктатура Пілсудзкага, баронячага інтарэсы капіталу, знаходзіць для сябе як у сялянскіх, так і ў рабочых згодніцкіх партыях, дапаможнікаў, якія спрабуюць захаваць свой уплыў на частку масы і пры дапамозе рэвалюцыйнай фразэалёгіі ўтаіць сваю контр-рэвалюцыйную сутнасьць.

Абапіраючыся на памянёныя элементы, Пілсудзкі пачаў выконваць ускладзеныя на яго задачы.

Улічваючы, што нават у групоўках абшарнікаў і капіталістаў існуюць ухіленьні ад лініі, намечанай яго валадарамі, як за межамі краіны, так і ўнутры яе, Пілсудзкі накіраваў усе стараньні на тое, каб давесьці да разлажэньня існаўшыя раней партыі і стварыць сваю, адзіную, быццам «звышклясавую», партыю. Паколькі пытаньне закранала партыі, прадстаўляючыя інтарэсы абшарнікаў і капіталістаў, яму гэта ў значнай ступені ўдалося. Ён стварыў «блёк супрацоўніцтва з урадам», у склад якога ўвайшлі і абшарнікі, і капіталісты, і кулакі, і ўхіліўшыяся ад сераднявіцкай партыі «Вызваленьне», і манархісты, і рэспубліканцы, і заядлыя «праўдзівапольскія палякі», прыхільнікі самага лютага прыгнечаньня нацыянальных меншасьцяй, і яўрэйскія буржуа, і украінскія прыхільнікі Пятлюры і беларускія адшчапенцы. Да самага апошняга часу ППС, як партыя, не ўваходзіла афіцыйна ў склад гэтага блёку, але яе лідэры ўсё-ж не адмовіліся перайсьці ў лягер Пілсудзкага. І толькі ў самы апошні час Пілсудзкім праароблена над ППС такая-ж апэрацыя, якая была праароблена ім і над іншымі партыямі. ППС раскалолася.

«На вачох у мільёнаў рабочых і сялян,—піша адносна гэтага тав. Сахацкі,—гніе і разлагаецца ППС—партыя згодніцтва і зрадніцтва, парыя патэнтаваных слуг капіталу. Сьветачы «польскага сацыялізму» ў якасьці аргументаў кідаюць адзін другому ў твар абвінавачаньні ў крадзяжы партыйных грошай, у спайваньні членаў арганізацыі, у падрабленьні подпісаў на вэксалёх, у фабрыкацыі паклёпніцкіх даносаў, у кулачнай расправе і г. д.

Гэты працэс гніеньня ППС зьяўляецца пабочным прадуктам зрастаньня ППС з буржуазеяй, зьліяньня яе з дзяржаўным апаратам фашысцкае дыктатуры. ППС, як цэлае, зьяўляецца часткаю фашысцкага лягеру. Незалежна ад прыналежнасьці да тэй ці іншай групы, да таго ці іншага адценьня, усе кіраўнікі ППС, кожны па-свойму, служаць дыктатуры абшарнікаў і капіталістаў. Розьніца паміж імі ў мэтадах, у спосабах ашуваньня і тэрарызаваньня рабочай клясы і сялянскіх мас.

Група Явароўскага і «Пшэдсьвіта» патрабуе адкрытага супрацоўніцтва ці, правільней, адкрытага выкананьня дырэктыў фашызму, у той час, як група нібы анапіцыйных правадыроў ППС імкнецца да таго, каб не паказаць перад масамі сваю прыналежнасьць да фашызму і прыкрыць сваю службу ў Пілсудзкага сказамі аб барацьбе з пасьлямайскаю сыстэмаю кіраўніцтва».

Раскол у ППС паступова падрыхтоўваўся Пілсудзкім і ні для каго ня быў неспадзянкаю, бо ён зьяўляўся няміннымі этапам у агрэсыўным разьвіцьці фашызму.

Асноўная задача польскага фашызму—прыдушэньне рэвалюцыйнага руху, поўнае зьняволеньне працоўных мас і разгром камуністычнае партыі—яшчэ далёка нявыканана. Іншых сродкаў, апроч узмацненьня белага тэрору і дзікіх зьверскіх рэпрэсій супроць рабочых і сялян, у польскага фашызму няма Але гэтымі сродкамі ён карыст

НА ФРОНЦЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

ДА СЯЎБЫ ЗАСТАЕЦЦА НЯ БОЛЬШ МЕСЯЦА

РАЙВЫКАНКОМЫ, СЕЛЬСАВЕТЫ, КАМІТЭТЫ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ, САВГАСЫ, КАЛГАСЫ, ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ,—ЦІ ЎСЁ ВАМІ ЗРОБЛЕНА ДЛЯ ЎЗЬНЯЦЬЦЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ?

У БССР магчыма разьвіцьцё бурачна-цукровае прамысловасьці.

Пры вырашэньні праблемы падвышэньня ўраджайнасьці не малую ролю можа адыграць увядзеньне новых культур. Гэткаю новаю культураю для Беларусі маглі-б быць цукровыя буракі, вопыты засеву якіх у мінулым годзе, як мы ўбачым ніжэй, далі вельмі добрыя вынікі.

Наглядзім, як гэта пытаньне выражаецца з тэаретычнага пункту гледжаньня.

Буракі, як вядома, патрабуюць для свайго разьвіцьця 160-170 безмарозных дзён, прычым сума сутачных тэмпэратур не павінна быць менш 1400° Ц. Для Беларусі мы маем: па Магілеўскай акрузе ліс марозных дзён за год—160, сума тэмпэратур ад 20-IV да 7-X—2517.3 гр; па Менскай акрузе—марозных дзён 159, тэмпэратура ад 20-IV да 7-X—2469.3 гр; па Барыўскай акрузе—марозных дзён 153, тэмпэратура—2541.3 гр.; па Мазырскай акрузе марозных дзён 147, тэмпэратура—2667.7 гр.; па Аршанскай акрузе—марозных дзён 162, тэмпэратура—2443.4 гр.

Такім чынам, кліматычныя ўмовы Беларусі зьяўляюцца зусім адпаведнымі для культуры цукровых буракоў. Да гэтага можна дадаць, што ў тых мясцовасьцях Паўночнае Амэрыкі Злучаных Штатаў, якія маюць клімат амаль зусім такі, як у Беларусі (згодна пасьведчаньню праф. А. І. Кайгарода), там вырока разьвіта сельне буракоў і бурачна-цукровая прамысловасьць (напрыклад, у штаце Вісконсін). У глебавых адносінах таксама ня можа быць перашкод для разьвіцьця засеву буракоў, бо глебы Беларусі, за выключэньнем хіба сыпучых пяскоў, якія даюць лёгка пры адпаведным угнаеньні 1000-1200 пуд. бульбы, змогуць даць добры ўраджай цукровых буракоў.

Грунтуючыся на гэтых тэаретычных даных, магчыма перайсьці да непасрэдных вопытаў. Гэта было зроблена ў мінулым годзе Наркамземам БССР, які вясною разаслаў насеньне цукровых буракоў у сорак пунктаў; апроч таго, розныя гатункі культываваліся таксама ў Горках на вопытных вучастках катэдры прыватнага земляробства. Атрыманыя кареньні буракоў былі дасьледаваны па выяўленьню процантаў цукру ў тэхналёгічнай лябараторыі Сельска-Гаспадарчай Акадэміі. Вынікі гэтага дасьледваньня наступныя:

Буракі з савгасу Высокае, Аршанскай акругі, далі 17,85 проц. цукру, з савгасу Бабінічы, Аршанскай акругі—17,00 проц. цукру. Па Магілеўскай акрузе: з савгасу Буйнічы далі 16,03 проц. цукру, з Клімавіцкага анор. пункту—18,21 проц. цукру, з Забалоцкай вопытнай балоты. гаспадаркі—16,07 проц. цукру, з Турскай вопытнай станцыі—16,12 проц. цукру. Па Гомельскай акрузе: з савгасу Востраглядны—16,34 проц. цукру, з савгасу Барысаўшчына—15,05 проц. цукру, з савгасу Навасёлкі—15,25 проц. цукру, з савгасу Запруж'е—18,34 проц. цукру. Па Менскай акрузе: з савгасу Тарасава—16,52 проц. цукру, з савгасу Старыца—13,58 процантаў цукру, з савгасу Дактаровічы—15,93 проц. цукру, з савгасу Зазер'е—16,66 проц. цукру, з савгасу Навасёлкі—17,02 проц. цукру, з савгасу Пагост—18,01 проц. цукру, з савгасу Пакрашава—15,22 проц. цукру, з М. Сляпянкі, у сярэднім з 33 вучаст.—16,25 проц. цукру.

Вопыты ў Горках паказалі наступнае: цукровыя буракі «Е. О.» далі 17,24 проц. цукру; пры ўраджаі каранёняў на гэкт. 287,9, процант цукру 49,6; буракі «Кальнік» далі 17,73 проц. цукру; пры ўраджаі на гэктар 290,0, процант цукру 51,4; буракі «Ф. У. С.» далі 18,39 проц. цукру; пры ўраджаі 330,0 на гэктар, процант цукру 60,7; буракі «У. С.» далі 18,73 проц. цукру; пры ўраджаі на гэктар 364,8, процант цукру 68,2; буракі «Ялтушкоўскія» з сунэрфасфатам далі 18,14 цукру; пры ўраджаі 242,3 на гэктар, процант цукру 44,0; буракі «Ялтушкоўскія» без сунэрфасфату далі 17,47 проц. цукру; пры ўраджаі 182,4 на гэктар, процант цукру 31,9.

Паказаныя лічбы дазваляюць зрабіць наступныя вывады: 1) па процанту цукру беларускія буракі стаяць крыху ніжэй, чымся украінскія, але перавышаюць буракі, атрыманыя ў многіх паўднёвых і ўсходніх мясцовасьцях (вынікі мінулага году); 2) па ўраджаю кареньняў на гэктар беларускія буракі ня ўступаюць, а ў некаторых выпадках і перавышаюць буракі, атрыманыя на Украіне.

Такім чынам, можна сказаць, што першыя вопыты культуры ў Беларусі цукровых буракоў далі вельмі добрыя вынікі.

Ня гледзячы на гэта, належыць у працягу шэрагу гадоў рабіць такія вопыты, уключаючы сюды і сялянскія гаспадаркі; апроч таго, неабходна правесьці шырокае эканамічнае абсьледваньне адпаведных раёнаў, каб ужо без памылак і сьвядома падысьці да вырашэньня пытаньня аб магчымасьці ўзьнікненьня бурачна-цукровае прамысловасьці ў Беларусі.

Праф. А. Ілючароў.

Ачысьцілі 50 проц. насеньня.

(Азарыцкі р., Мазыршчына).

Працу па падвышэньні ўраджайнасьці і падрыхтоўцы да наслёўной кампаніі Азарыцкі раён распачаў своечасова і ў зьвязку з гэтым маюцца досыць значныя станоўчыя вынікі. На 1-ае сакавіка заданьне па ачысткі насеньня выканана на 50 проц. (Зараз, бязумоўна, процант выкананьня большы). Ачышчана па ўсяму раёну насеньня звыш 250 тонаў.

Азарыцкі раён у падрыхтоўцы да вясновай сяўбы лічыцца 2-м у Мазырскай акрузе.

Па раёну вандруюць зараз у кожным сельсавеце зерноачысьцільныя абозы, якія працуюць з поўнай нагрузкай.

З ліку 13 машын маецца 7 трыераў, рэшта—ня зусім здавальняючыя ня кажучы ўжо аб тым, што акрсельсаюз не даслаў яшчэ 2 трыеры, 1 сартыроўку і 1 трашчотку.

Камітэты сялянскай узаемадапамогі таксама разгарнулі працу па ачысткі насеньня. 2-ма трыерамі, якія набыты на сродкі камітэтаў, ачышчана 84 тоны насеньня. Сельска-гаспадарчая кааперацыя ачысьціла 60 тон.

Наогул справа з ачысткай насеньня ў Азарыцкім раёне абстаіць добра, бо самі сяляне зразумелі карысьць ачысткі і пратручваньня насеньнага матар'ялу.

Поруч з добрым ёсьць і благое. На раён намечана 23000 руб. крэдытаў на вясновую насеўную кампанію, але гэта пакуль што абяцанка; з акрсельсаюзу аб гэтых грошах—ні слуху, ні духу.

Цікава таксама і тое, што ў акрузе пры дачы заданьняў, колькі трэба ачысьціць у раёне насеньня, азарычам намецілі 568 тон, фактычна-ж гэтулькі сялянства наогул не высявае, а куды меш.

Варта адзначыць таксама і аб адной цікавай пастанове Мазырскага акрвыканкому. Згодна гэтай пастановы, кожны селянін павінен у абавязковым парадку зьбіраць попел. Невыкананьне гэтага выклікала сабою штраф. Праўда гэта дзіўная пастанова тыдні прав 2 адменена самім-жа АВК, але гэта кажа якую «працу» праводзіць акруга, каб растлумачыць сялянам карысьць угнаеньня попелам. Селянін.

Яы рыхтуецца Меншчына да насеўкампаніі.

Да сяўбы засталося зусім мала часу, а падрыхтоўка ідзе павольна, асабліва па сельсаветах. Праўда, некаторыя акруговыя і цэнтральныя ўстановы паваг належным чынам не раскачаліся.

Трэба застаўшыся час як мага поўнасьцю, мабілізаваўшы ўсе нашыя сілы і сродкі, выкарыстаць для найлепшай падрыхтоўкі, каб выканаць пастаўленыя задачы на падвышэньню ўраджайнасьці, пашырэньню насеўнай плошчы і калектывізацыі вёскі.

Адным з культурных мерапрыёмстваў, якому ўлучана найбольшая ўвага партыйнымі, савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі, ёсьць ачыстка насеньня. З ачысткаю насеньня раскачаліся вельмі позна. На 15 сакавіка па акрузе ачышчана ўсяго сялянскага насеньня 8148 тон, што складае толькі 50 проц. заданьня. Пры наяўнасьці 328 машын Узьдзенскі і Лагойскі раёны праяўляюць у гэтым нытаньні проста нядбайнасьць: першы ачысьціў толькі 19,5 проц., а другі 30 проц. заданьня, тады як А.-Гарадзецкі раён ужо выканаў 119 проц. заданьня. Нагрузка машын надзвычайна малая, напэўна на падбайнасьці той ці іншай установы. З насеннага фонду КСУ ачышчана толькі 25 проц., крэдтаварыствы, савгасы і калгасы таксама не ачысьцілі свайго насеньня.

Трэба дабіцца поўнай нагрузкі машын, арганізаваўшы ачыстку ў дзьве зьмены. Толькі пры такіх умовах магчыма выканань заданьне па ачыстцы насеньня да сяўбы.

Акруга насенным аўсом і ячменем у асноўным будзе задаволена, але маючы на ўвазе, што ня ўсе заяўкі на насеньне магчыма будзе задаволіць, трэба берагчы мясцовае насеньне.

Зусім дрэнна абстаіць справа з насенным фондам лубіну, канюшыны і вікі. Гэтыя культуры дзякуючы асеньнім марозам у значнай меры былі папсуты і на завоз таксама асаблівай надзеі няма. Вось чаму неабходна ўзмацніць праз с-г і спажывецкую кааперацыю загатоўку гэтых культур на мясцовым рынку.

Па пляну мяркуецца арганізаваць на акрузе 59 калгасаў, зараз ужо арганізавана каля 49 калгасаў з агульнай плошчай каля пяці тысяч гэктараў. Калі на колькасьці тэмп арганізацыі калгасаў нас можа задаволіць, то па разьмеру калгасаў ні ў якім разе задаволіцца немагчыма. Зараз узята ўстаноўка, каб кожны калгас меў ня менш як 150 гэкт., з такою плошчаю калгасаў арганізавана зусім мала. Арганізацыя дробных калгасаў тлумачыцца недастаткова напярэдня праведзенай арганізацыйнай працаю.

Ня ўсе райёны адналькова адносяцца да арганізацыі калгасаў. Ёсьць райёны, напрыклад Барысаўскі, дзе арганізавана ўжо 9 калгасаў, але ёсьць і такія, як Самахвалавіцкі, дзе не арганізавана яшчэ ніводнага.

У гэтым годзе станоўчае ў арганізацыі калгасаў тое, што арганізацыя іх ідзе за лік зямель працоўнага сялянскага карыстаньня, са значна большай колькасьцю серадняцкіх гаспадарак.

Яшчэ ня ўсё зроблена ў справе зьбіраньня попелу па акрузе. Больш-менш добра наладжаны збор яго ў Менску і за апошнія часы ў Барысаве. Сялянства яшчэ ня ўсюды зьбірае попел, але ў некаторых раёнах, як Чэрвенскі, Пухавіцкі, Сьмілаўскі і Барысаўскі, ужо ёсьць досыць значныя вынікі. На збор попелу трэба зьвярнуць больш увагі.

Паход камсамолу «за ўраджай» яшчэ ня прыняў канкрэтных форм, а абмяжоўваецца пакуль што тым, што пытаньне аб узьняцьці ўраджаю прапрацавана толькі на камсамольскіх сходах, зроблена некалькі «паходаў» ва ўстановы, маючыя дачыненьне да правядзеньня насеўкампаніі і сабрана 800 руб. на трактар. Прафсаюзы таксама амаль нічога ня робяць.

Досыць шырока разгорнута на акрузе сярод сялянства агрыкультурная прапаганда. Усяго будзе праведзена да пачатку сева 113 розных курсаў, якімі павінна быць ахоплена 1520 ч. бядняцка-серадняцкага і камсамольскага вясковага актыву.

Слаба ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да насеўкампаніі шэфтаварыствы гораду, якія больш абяжоўваюцца насылкаю ў падшэфную вёску 1—2 таварышоў на 1—2 дні.

Трэба дабіцца актыўнага ўдзелу рабочых мас у насеўкампаніі.

Я. Казак.

ПАСЬЛЯХОВАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ.

(Ад нашага полацкага карэспандэнта).

З боку акрсельсаюзу прыкмячаецца пасьляховасьць у падрыхтоўцы да сустрэчы чарговай насеўкампаніі. Былі прыняты ўсе захады да своечасовага завозу насеньня, угнаеньня і машын.

Да 20 сакавіка завезена аўса 200 вагонаў, ільнанасеньня 43 вагоны; сунэрфасфату 63 вагоны, фасфарытнай мукі 14 вагонаў, калійнай солі 10 вагонаў, плугоў 6318 шт., бароН 800, асыпнікаў 400; арфаў 218, сартыровак 70, трыераў 7. На бульбу дадзена разнарадка на 100 вагонаў. Карняплодаў завезена ў дастатковай колькасьці. Усе завезеная колькасьць разьмеркавана па райёнах і ўжо завезена на месцы прызначэньня.

Але дрэнна абстаіць справа з канюшынай, вікай, ячменем і лубінам. Канюшыны пакуль што завезена толькі 16 тон, замест намечаных на пляну 160 тон, вікі 17 тон, ячменю 48 тон, лубіну няма і невядома дзе яго можна атрымаць. Самае балючае пытаньне—канюшына, якой таксама няма.

Акрсельсаюзу яшчэ неабходна зрабіць вялікую працу па загатоўцы аставшагося насеньня, бо насельніцтву завезенага насеньня ня хопіць.

Сьнір. Міхальцоў.

ЗА ЗРЫЎ ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЯЎНОЙ КАМПАНІІ.

КІМАВІЧЫ, 25-3 Не памяншаючы добрай працы аграпэрсаналу Кімаўшчыны па падрыхтоўцы да вясеньняй насяўной кампаніі, паставіўшы яе на належную вышыню (што падтрэсьлена прадстаўнікамі акругі, рабіўшымі праверку), трэба з усёю натугаючасьцю адзначыць недапусьцімыя адносіны аднаго з агрэпрацаўнікоў раёну Курэпіна Алесь. Гэты падрайённы пам. агранома, замест агранамізацыі насельніцтва і назгортваньня на ўсю шырыню працы, да прадотапчай сяўбы—увесь час п'янствуваў, сімуліраваў, адсутнічаў на даручаным вучастку, не да ючы належных вед райаграному і наогул зрываў вясеньняю насяўную кампанію.

Прэзыдыум РВК правёдзіла ацэнку «мастацтва» пам. агранома Курэпіна і ўхваліў зьнять яго з працы.

Рабкор.

ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ І ПАДВЫШЭНЬНЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ

(Аршаншчына).

Па акрузе праводзіцца растлумачыцельная кампанія па падвышэньню ўраджайнасьці і новаму закону аб сельска-гаспадарчым падатку на 1929-30 г. На агульных сходах сялян весак зачытваюцца дакрэты аб падвышэньні ўраджайнасьці і сельска-гаспадарчым падатку і тут жа яны растлумачваюцца.

Сяляне пасёлку Вясёлы, Аршанскага раёну, пасьля заслуханьня дакрэтаў, вынесьлі пастанову—ўсім пасёлкам арганізавацца ў калгас. Аб гэтым яны ўжо падалі і заяву ў райвыканкам. Так сама пасялкоўцы парашылі правесьці ў сваіх гаспадарках усе тыя мерапрыёмствы, аб якіх ім тлумачыў агранам, каб падвысіць ураджайнасьць.

Сяляне другіх пасёлкаў Веравойшанскага сельсавету парашылі арганізавацца ў пасёлках малымныя таварыствы. Усюды абраны аграўпаўнаважаныя і зроблен запіс на набыцьцё штучнага ўгнаеньне і насеньня. Калюжны.

Архіўны Сталыпін.

— Хай тры дзесяціны, хай менш будзе, але хутар, хутар мне дайце...

— Хай хутар будзе без вады, бяз выгану, бяз лесу, але затое зямля будзе ў адным месцы.

— Мне прыкра жыць у абшчыне, я вар'ятам урэшце буду... Хутар, хутар дайце!

... Хутар. Магічнае слова. Сяляне марылі аб кавалку зямлі, адрэзаным ад усяго «абшчыннага», аграніччанага дубовымі стаўпамі, з шырокімі аршынныні межамі. Дробна-буржуазная эгаістычная рыса ўласнасьці захапляла амаль што кожнага селяніна, асабліва заможнікаў і кулакоў.

Кулак з прытоенай радасьцю і надзеямі глядзеў на «хутары»—панскія маёнткі і марыў вабыць нешта падобнае сабе. Хата, адрэзаная ад «шумнага сьвету», больш спадручна для эксплёатацыі батрацтва і вакольнага сялянства, больш мае перспэктыў для перараджэньня ў панскі маёнтак.

Середняк, гледзячы на свайго „старэйшага брата", таксама гарэў надзеяй атрымаць кавалачак зямлі,—уласны, непарушны, недзялімы. Якая справа да таго, што зараз канцы ня сходзяцца з канцамі, што вясною прыходзіцца сядзець бяз хлеба і без магчымасьці засеяць палі, што і наваўтра ня ўсьміхаецца доля шчасьцем, але—хутар, хутар дайце!

Бядняк «хадзіў расхлістаны і босы, —прыбіты, цёмны, бесгалосы—у людакай сям'і прыблудай рос», але ўсёроўна ў хутары бачыў паратунак свайго бязвыходнага становішча. Цяжка будзе, але на хутары я буду вольнай птушкай... І жорсткая рука Сталыпіна рассыпала вёскі жменяй капіталістычнай рэформы па хутарох, па «ўласных кавалках», рабіла сялян „вольнымі птушкамі", прыкаванымі моцнымі ланцугамі ўласнасьці да няштасных трох дзесяцін. Рэформа затуманьвала клясавае расслаеньне вёскі, уводзіла погляд селяніна ў чатыры куты сваёй уласнай, непарушнай хаты, зачыняючы гарызонт на жыцьцё па-за хатай, па-за хутарам.

Ня стрымала супроць хвалі сталыпінізацыі і вёска Жэвань, Дрыбінскага райёну, Аршанскай акругі. Шэрыя плямы саламяных стрэх расцінуліся па полі. Так было даўно, здаецца ў трынаццатым годзе. Расквіталіся з дзікай і анкультурнай абшчынай і пачалі будаваць „новае жыцьцё", аснаванае на „маім, уласным, непарушным".

Ня будзем казаць як прайшлі гэтыя паўтары дзесяткі год жыцьця на хутарох. Лепш за ўсё скажа аб гэтым наступны факт. Сёлета зімой дваццаць чатыры гаспадаркі хутароў—беднякі і серадняк—арганізавалі сельска-гаспадарчую камуну на 170 гэктарах зямлі.

... Сталыпін пахаваны. Сталыпін у архіве. Які моцны кантраст—хутары, пашнураваныя сеткай шырокіх меж, з трохпольлем, галадухай, некультурнасьцю і буйны калгас з рашучай пастановай—«у выпадку выхаду з камуны паасобных сяброў—зямля з вучастку камуны ім не зьвяртаецца».

Жыцьцё—унівэрсытэт. Пятнаццацігадовая пакута на хутарох навучыла 24 беднякоў многаму. Лёгка рэчаў прымусіла сялян пахаваць стылыпінішчыну ў архіў спадчыны.

Цім. Зарэчны.

У ГАРОЧЫЦАХ.

(З ПАДСЛУХАНАГА І ПАДГЛЕДЖАНАГА).

— Што гэта за машына? Я яшчэ такой ня бачыла. І шыпіць.

— Гэта прымус.

— Бач, прымус. А навошта ён?

— Гатаваць можна страву.

— Гатаваць?—Не, на гэтым не нагатуеш, што вы мяне дурыце старую. Бяз печы не абыдзешся.

— Пайду ўжо,—кажа абражаная,—няма калі стаяць, трэба кудзелю прасьці.

— І нам трэба ісьці брацца.

— Ты можаш і застацца яшчэ, у цябе-ж самапрадка—калаўрот (апошняе слова тэхнікі ў Мазырскай вёсцы), хутчэй спрадзеш за нас.

— Кабецінкі, а каб зусім яе ня прасьці? Добра было-б?

— Дзіва, што добра, але гэтага нельга.

— Чаму нельга?

Ды так: не спрадзеш, ня вытчаш, дык голым хадзіць будзеш.

— А чаму іншыя не прадуць і голымі на ходзяць?

— Мала што іншыя, а нам нельга, за нас ніхто ня зробіць.

— Ніхто? А машына?

— Яно добра машына, але як-жа гэта зрабіць?

— Арганізаваць таварыства.

— А і праўда.

Яшчэ некалькі гутарак з жанчынамі на гэту тэму—і нарадзілася імкненьне заснаваць ільнаводнае таварыства.

— —

— Ніколі больш ня буду гуляць у карты. Ад гэтага дню зарокаюся. Нехай яго, аж у газэту папаў!

— Але-ж пра мяне няма ў газэтцы. Усіх прапісалі: і Яньку, і Апанаса, і Юрку, а мяне ня ўведалі.

На другі дзень у новым чырвоным кутку вісіць новая насьценная газэта з заметкаю і малюнкам пад загалоўкам —«Загадзя ўзрадаваўся».

— Хто-ж бы гэта мог? Хто пераказаў? Здаецца, нікога такога і няма. Папаўся такі і я...

І апусьціліся рукі ў хлапца для гульні ў карты.

Газэта зрабіла свой выхаваўчы ўплыў.

— Калі? Заўтра? Ужо?

— Нахай бы яшчэ ў нас пабылі.

— Трэба і ў іншыя вёскі.

— Праўда, трэба, але шкода, ад нас выяжджаеце.

І адчуваецца самая цёплая шчырасьць у словах.

— Мой хлапец дык вельмі хоча паехаць разам.

— Паехаў-бы?

— Каб толькі ўзялі.

І «памоцнік» з захапленьнем зьбіраецца вандраваць па Мазыршчыне.

— Чуў? Мікола паедзе разам!

— Во шчасьлівы!

«По-жар-ный са-рай»,—чытае прадстаўнік рэдакцыі шыльду, апанаваны адміністрацыяй лесапільнага заводу.

— У вас і пажарная дружына ёсьць на заводзе! А ці нельга пацікавіцца, якія вы маеце прылады? Можна адчыніць?

— Ды... гм... там... мая карова...

— Чыя?

— Іхняя, дырэктарава.

— А інструманты?

— Бачыце... дах на хлаве працякаў, дык я баяўся, каб машына не паіржавела... У канторы стаіць, калі ласка...

А ў гэты час качагар Коля (па загаду дырэктара, які заўважыў прадстаўніка рэдакцыі яшчэ далёка ад брамы) насіўся па кватэрах, зьбіраючы пажарныя сякеры, вёдры з памыя мі, бочкі, не абмінуўшы і кватэры самога дырэктара. Змарыўся ён, небарака, абчышчаючы вёдры ад цамыяў для „смотру", больш, чымся каля сваёй качагары.

— Дзядзечка, вось 89 капеек, вынішыце газэту «Савецкая Беларусь».

— Яна-ж каштуе 90...

Слушчаныя сарамліва вочкі і маўчаньне ў адказ.

— На чыё імя выпісваць?

— Імя? Не, у школу, нам, вучням Убалоцкае школы, Зеляноцкага сельсавету. Мы зьбіралі па капейцы, дык не хапіла... Толькі 89.

І з захапленьнем атрымліваюць дзеці квіток на выпіску газэты, якая першаю прыехала ў вёску, першаю паказала машыну і працэс друкаваньня газэты.

Г.

Трэба ўзмацніць працу.

(*Ліст з Лепеля*).

Па колькасьці сельска-гаспадарчых вытворчых аб'яднаньняў—Лепельшчына займае першае месца ў Полацкай акрузе. Па нараду сельсаюзу райёну Лепельшчына павінна атрымаць 23 вагоны насеннага аўса, дзеля кантрактацыі 1000 п. гатункованага ячменю і 2000 п. ільнанасеньня. Насеньне ўжо пачынае прыбываць.

Тым часам у Лепельскім таварыстве яшчэ не падшукана памяшканьне для захаваньня насеньня. Вось чаму авёс, які мае 18-20 процантаў вільгаці, пустым слоем ляжыць у дрэнных памяшканьнях. Трэба Лепельскаму РВК хутка парупіцца на конт складаў, бо насеньне да раздачы можа сапсавацца. Кепска абстаіць справа з памяшканьнямі для насеньня і ў іншых таварыствах.

Тая колькасьць угнаеньня, якая засылаецца ў райён, недастаткова, яе хопіць толькі для кантрактацыі і можа часткова для калгасаў.

Насеньня канюшыны няма,—а гэтым самым зрываецца праца па пераводу гаспадарак на шматпольле. З боку сельсаюзу будуць здаволены цалкам залуўкі крэдытных таварыств на сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Сартыровачныя абозы толькі цяпер яшчэ пачынаюць разгортваць сваю працу. Па пляну прадугледжана ачысьціць 1000 тон рознага насеньня, пакуль што плян выканан толькі на 25 пр. Устаноўленыя акрэа преміі кіраўнікам абозаў за лепшую працу ў сэнсе большай ачысткі насеньня—стварылі некаторы пералом і зацікаўленасьць самых кіраўнікоў. Але побач з гэтым сустракаюцца факты, калі кіраўнікі абозаў у квітанцыях адзначаюць большую колькасьць прапушчанага насеньня, чым у сапраўднасьці. Працаўнікі аграпамаі і крэдытных таварыств да гэтага часу ня прымалі крокаў па ачысткі насеньня мясцовай загатоўкі.

Лепельскім РВК выпрацаваны райённы плян насеўкампаніі і разасланы па сельсаветах, але апошнімі складзены пляны не канкрэтныя, з сэрыяй агульных фраз: «трэба пашырыць», «падняць», «неабходна арганізаваць» і т. д. (Каменскі і Вароньскі сельсаветы) РВК наўважліва аднёсься да праверкі гэтых плянаў, а між тым выправіць іх трэба было-б.

Наконт правядзеньня насеўкампаніі грамадзянская думка досыць мабілізавана, але практычных мерапрыемств вельмі мала. Попел дрэнна, амаль што зусім ня зьбіраецца, малы ўдзел прымае настаўніцтва (за выключэньнем с. Каменя), камсамольскія ячэйкі атрымалі шэраг дырэктыў,—але паход за ўраджайнасьць пакуль што не пачыналі.

Лепельскі райзо ўвязаў пляны сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў, райКСУ і аграпамаі. Асаблівай ініцыятыве з боку райагранома ў сэнсе арганізацыі вытворчых калектыўных аб'яднаньняў, кантрактацыі, і размеркаваньня насеньня няма. Былі выпадкі, калі з Валосавіцкага т-ства прыехала 30 падвод за 22 клм. разгружаць прыбыўшы вагон аўса і чакалі райагранома з раніцы і да самага вечара, пакуль прышоў ён узяць пробу.

Насеньне ўжо разьмяркована па сельсаветах. Да сьпісаў складзеных сельКСУ для раздачы насеньня трэба падыйсьці вельмі асьцярожна, каб ня было кумаўства, сваяцтва і г. д. Справу кантрактацыі ільна-валакна 400 гэктараў трэба зараз-жа прасунуць да сельска-гаспадарчых вытворчых аб'яднаньняў і да вёсак, дзе ёсьць групавыя жаданьні сялян.

Тэхнічны апарат павінен быць гатоў для бесперабойнага і хуткага афармленьня выдачы насеньня, устанавіўшы тэрміны для кожнай вёскі паасобку.

Лепельшчыне трэба мабілізаваць усю энэргію, каб зьнішчыць своечасова недахопы перад сяўбою.

Анучын П.

НА ГРАМАДЗКУЮ ПРАВЕРКУ.

(КОНКУРС ДЛЯ ВЫЯЎЛЕНЬНЯ САВГАСАЎ, ЯКІЯ НАЙЛЕПЕЙ ПАДРЫХТУЮЦЦА ДА СЯЎБЫ.)

Белсельтрэст праводзіць конкурс дзеля выяўленьня савгасаў, якія лепей падрыхтуюцца і найбольш пасьпяхова правядуць насеўную кампанію, аказуць найбольш рэальную дапамогу ў агранамізацыі і ўзьняцьці ўраджайнасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Рабкоры, селькоры, рабочыя камітэты, аграномы, сельска-гаспадарчыя гурткі, самі кіраўнікі савгасаў павінны безадкладна паінфармаваць савецкую грамадзкасьць, як савгасы—буйныя сацыялістычныя прадпрыемствы ў сельскай гаспадарцы—выконваюць дырэктывы партыі і савецкага ўраду.

Згодна палажэньня аб конкурсе, рабочыя калектывы савгасаў атрымаюць преміі ў выглядзе поўнага ўкамплектаваньня рагатай жывёлай, інвэнтаром, абсталяваньне клюбаў, бібліятэкі ці камандыроўкі на дасьледчыя станцыі, у лепшыя савгасы і інш.

А што будзе з тымі, якія злачынней сьпячкай, нядбайнасьцю зрываюць вялізарныя задачы, пастаўленыя партыяй у барацьбе за ўраджай?

Партыя, урад і ўся савецкая грамадзкасьць ужо сказалі сваё аўтарытэтнае слова. Пралетарскі суд, грамадзкая ганьба ўсім разгільдзяям, чыноўнікам, якія ня ўмеюць выконваць дырэктыў партыі і ўраду, ня могуць аб'яднаць вакол пастаўленых задач усіх рабочых, шырокія бядняцка-серадняцкія масы.

Савецкія гасп. трымаюць экзамен.

Пашырыць на 7 проц. насеўную плошчу, узьняць на 17 пр. у сярэднім на БССР ураджайнасьць (а ў асобных гаспадарках падвоіць) пры зьніжэньні ня меш як на 10 проц. сабекошту прадукцыі, стаць вялізарным выхавальнікам гатункованага насеньня, племянной жывёлы і садовага матар'ялу, зьяўляючыся адначасова сапраўдным цэнтрам агравытворчага пераўтварэньня бядняцка-серадняцкага сялянства ў напрамку калектывізацыі, вытворчага кааперараньня і ўзьняцьця ўраджайнасьці—асноўныя задачы экзамену.

Непасрэдная арганізацыя калгасаў, пасялковых, машынных, насенных, малочных таварыстваў, арганізацыя вытворчых канферэнцый сялянства па ўзьняцьці ўраджайнасьці, пралетарскае шэфства рабочых калектываў над калгасамі, таварыствамі, пасёлкамі, вёскамі з агравытворчай дапамогай, большае прыцягненьне сыравіны на прадпрыемствы савгасаў, максымальна поўнае выкарыстоўваньне рамонтных майстэрняў, збожжаачысных машын, прыцягненьне беднаты на курсы для рабочых—актуальнейшыя задачы, над якімі павінны ўпарта працаваць савгасы, як жывыя стымулы калектывізацыі.

Праверка, якая робіцца па савгасах у сучасны момант, нарада кіраўнікоў, старшынь рабочых камітэтаў Менскай акругі, якая нядаўна скончыла сваю працу, яскрава надкрэсьлівае правал на экзамене шэрагаў савгасаў.

Вось першыя акты праверкі падрыхтоўкі савгасаў. «Савгас яшчэ ня прыступіў да ачысткі насеньня і аказаньня арганізаванай насельніцтву»... (савгас Савічы). «Ніхто нічога не рабіў і ня робіць і нікому да гэтага справы няма»... (Цытва). «У Межаве на 2-х трыерах і 3-х «Трыумфах» ачышчана 5,8 тон, ачыстка пачалася ледзь з 7-II". «На рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару насельніцтва праца не пачата». «Агрыкультурная дапамога насельніцтву з боку савгасу не пачыналася і машыны „Трыумф" і трыер стаяць бяз працы. Попел у кватэрах рабочых ня зьбіраецца"... (Слабада, Мазырскай акр.). «Кузьня ў савгасе (Ліпава) не працуе»...

Гэты сьніс можна было-б павялічыць у некалькі разоў. У савгасе „Бабы" інвэнтар сялянам не рамонтуецца, попелу сабрана дзесятак пудоў, зерноачышчэньне праходзіць слаба.

Кіраўнікі гэтых савгасаў пераакзаменуюцца і прэміяльную ўзнагароду павінны атрымаць у судовых установах.

Дзе былі вытворчыя камісіі, нарады, дзе быў рабочы кантроль? Гэта засьведчыць аб слабасьці працы рабочкомаў, вытворчых камісій, нарадаў. Без калектыву рабочых гэтых задач ня ўзьняць. На чале выкананьня вялікіх задач кампаніі павінны стаць вытворчыя нарады.

А вось некаторыя лічбы становішча падрыхтоўкі па Менскай акрузе. Ачышчана сялянскага збожжа на 1-III 12157 цэнтнэр., ледзь 25 проц. заданьня, і амаль усе хаваюцца за мароз у зрыве гэтай працы. Хутка пачнуць хавацца за бездарожжа—шырму чыноўнікі заўсёды знойдуць.

На 1-III заставалася яшчэ не абмалочанага насеньня 600 цэнтнэр., не адсартавана насеньня саміх савгасаў звыш дзьвюх з паловаю тысяч цэнтнэраў.

Попел хоць і сабраны ў разьмеры 2133 цэнтнэр., аднак, зьбіраецца пад жорсткім загадам. «Мішэньню на фронце кампаніі зьяўляецца мяшок з попелам: калі не сабраў, дык і ў трэст не хадзі»—чуліся на нарадзе пратэстуючыя размовы.

Пельга не назваць адзінак, якія надзвычайна добра вырашаюць гэту справу. Савгас Зарэчча забраў з заводаў 162 цэнтнэры попелу, Навасёлкі—276 цэнтн., Харапуць—звыш 250 цэнт., Рыме—135 цэнтн., Саламарэчча—176 цэнт.

Найбольш злачынным, аднак, у агравытворчай дапамозе трэба прызнаць становішча з рамонтам с.-г. інвэнтару. У савгасах да арганізацыі новых 30 майстэрняў і навала 82. Працу іх трэба лічыць неразгорнутай.

Майстэрні Меншчыны на 1-III адрамантавалі 89 машын. Не хапае і патрэбнага матар'ялу. Шыпяны, Леніна, Бабы, Велень і дзесяткі іншых савгасаў нічога не зрабілі ў гэтай найважнейшай справе. Сьпяць—кааперацыя, сельсавет, КСУ усе, хто павінны падказаць селяніну своечасова правесьці гэту справу. Ня чутна пра арганізацыю калгасаў, кааперацыйных аб'яднаньняў. Найбольш «асьцярожныя» кажуць: „ужо не да калгасаў, калі самыя простыя справы ня выкананы".

Яшчэ ня позна адрэтаваць ад правалу насеўкампанію ў савгасах і стаць на чале паходу за ўраджай; патрэбна вайсковая дысцыпліна і ўпартая праца на ўсім насеўным фронце.

Зьнішчэньню хібаў і павінен дапамагчы грамадзкі агляд—конкурс на лепшую падрыхтоўку да правядзеньня вясеньняй сяўбы. Галоўнае зараз у тым, каб поўнасьцю скарыстаць вбожжаачышчальныя машыны, працуючы ў дзьве зьмены, пасьлаўшы лепшых кіраўнікоў на гэту справу. Безадкладна разгарнуць рамонт інвэнтару. На справе распачаць працу па аграмаджаньню індывідуальных гаспадарак, непасрэдна арганізуючы калектыўныя, кааперацыйныя аб'яднаньні. Прав шэфства кожны савгас на дагаворных пачатках павінен шырока разгарнуць агравытворчую дапамогу спачатку ў адным ці некалькіх гнёздах з бядняцка-серадняцкіх складам насельніцтва. Неабходна тэрмінова скончыць абмен палепшанага насеньня. Астатак часу максымальна скарыстаць на ўнутраную падрыхтоўку—вызначэньне дэталяў у барацьбе за ўраджай, каб з баявой гатоўнасьцю падысьці да працы на палёх.

За праверку і безадкладнае ліквідаваньне хібаў!

Т. Аўчыньнікаў.

Нядбайнасьць ці злачынства?

Белдзяржгандаль атрымаў ліст ад селяніна Рамано

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

аб праверцы выканаўня пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР за 4 отдзяня 1928 г. «пра павялічэньне асыгнаваньняў на выдачу пэнсій інвалідам вайны, іх сем'ям і сем'ям асоб, якія загінулі на вайне.

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі аб праверцы выканаўня пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР „Пра павялічэньне асыгнаваньняў на выдачу пэнсій інвалідам вайны іх сем'ям і сем'ям асоб, якія загінулі на вайне» «З. З. СССР 1928 г., № 3, арт. 28) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў узмацніць нагляд за выкананьнем адпаведнымі ўстановамі пастановы ураду СССР і БССР пра выдачу пэнсіі інвалідам вайны.

2. Паказаць Вінебскаму Акруговаму Выканаўчаму Камітэту на тое, што ім унесена ў бюджэт сума на выдачу пэнсій інвалідам вайны менш 175 проц. фактычных выдаткаў за 1926-27 г. і ў меншым разьмеры, чым прынята СНК БССР пры разглядзе бюджэту, што лічыць недапушчальным.

3. Паказаць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня на невыстарчальнае з яго боку інструктаваньне і нагляд за работаю акруговых інспэктароў сацыяльнага забясьпечаньня, а таксама на тое, што на былі ім ужыты належныя захады да поўнага ажыцьцяўленьня памянёнай пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР.

4. Абавязаць Народны Камісарыят Сацыяльнага Забясьпечаньня прыцягнуць да дысцыплінарнай адказнасьці тых акруговых інспэктароў сацыяльнага забясьпечаньня, якія не зьвярнулі належнай увагі і не наглядалі належным чынам за работай райённых выканаўчых камітэтаў у справе скарыстаньня асыгнаваных па бюджэту на выдачу пэнсій інвалідам вайны сродкаў.

5. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня разам з акруговымі выканаўчымі камітэтамі ўжыць захады для прыцягненьня да адказнасьці тых працаўнікоў райённых выканаўчых камітэтаў, якія вінаваты ў несваячасным падліку ў 1927-28 г. інвалідаў і іх сем'яў і ў няпоўным выдатканьні сродкаў.

6. Для больш хуткага афармленьня выдачы пэнсіі інвалідам вайны і іх сем'ям і для вынішчэньня цяганіны, запрапанаваць райённым выканаўчым камітэтам і гарадскім саветам разглядаць заявы аб пэнсіі не пазьней, як на працягу месяца.

7. Абавязаць райённыя выканаўчыя камітэты палепшыць пастаноўку падліку забясьпечаньня інвалідаў, іх сем'яў і сем'яў загінутых на вайне, а раённыя рэвізійныя камісіі—раз у кожны тры месяцы паверяць, як робіцца падлік, афармляецца і ўтвараецца сама выдача сродкаў на пэнсію інвалідам вайны.

8. Запрапанаваць Дзяржаўнаму Фінансавому Кантролю пра ўсе выяўленыя па рэвізійных матар'ялах райённых рэвізійных камісій выпадкі скарыстаньня сродкаў, прызначаных на выдачу пэнсій інвалідам вайны, не па прызначэньні паведамляць пракуратуру для прыцягненьня, вінаватых да адказнасьці.

9. Запрапанаваць Бабруйскаму Аддзяленьню Дзяржаўнага Фінансавага Кантролю паверыць прычыны скарыстаньня Бабруйскім гарадзкім саветам і райённым выканаўчым камітэтам не па прызначэньні сродкаў на выдачу пэнсій інвалідам вайны ў 1927-28 г. для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

6-га сакавіка 1929 г.
г. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу аб праробленай сельска-гаспадарчай кампэрацыяй працы для правядзеньня вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі.

Выслухаўшы даклады аб праробленай сельска-гаспадарчай кампэрацыяй працы для правядзеньня вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. Адзначыць, што:

а) арганізацыя пярвічных вытворчых аб'яднаньняў дагэтуль ідзе слабым тэмпам. Асабліва слаба арганізуюцца машынныя насеннаводныя, малочна-жывёлагадоўчыя і мэліяратыўныя таварыствы. Недавальняючая ідзе кампэраваньне насельніцтва, асабліва бяднякоў частка яго і зусім дрэнна пастаўлена праца на скарыстаньню выдзелевых фондаў на кампэраваньне беднаты. Слаба і недавальняюча ідзе прыток у сельска-гаспадарчыя аб'яднаньні ўласных сродкаў насельніцтва;

б) поўна разгарнулася праца на кантрактацыі на мясных нагул і зусім ня прыступлена да правядзеньня доўгатэрміновай кантрактацыі; задавальненьне кантрактацыі сродкамі вытворчасьці невыстарчальнае;

в) дырэктывы ўраду пра ўзбуйненьне калгаснага будаўніцтва ажыцьцяўляюцца недастаткова, арганізуецца шмат дробных калектыўных гаспадарак;

г) недастаткова ідзе адгрузка для пасеўнай кампаніі барон, кульціватараў, дзісковых сеялак і зусім дрэнна малочнага інвэнтару і запасных частак. Недавальняюча праводзяцца загатоўкі будыбы і насенных траў, асабліва канюшины, лубіну і вікі;

д) падрыхтоўчая праца на будаўніцтву прадпрыемстваў для перапрацоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў ідзе недавальняюча і да гэтага часу шмат праектаў і каштарысаў не паданы і не зацьверджаны;

е) пеарганізаваны вызначаныя ў пляне майстэрні па рамонту сельска-гаспадарчых машын;

ж) ёсьць шэраг выпадкаў, калі райённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы недастаткова разгарнулі працу для правядзеньня пасеўнай кампаніі і не зьвярнулі выстарчальнай увагі на працу сельска-гаспадарчай кампэрацыі;

з) ёсьць шмат выпадкаў, калі сельска-гаспадарчыя машыны нездавальняюча скарыстоўваюцца і хаваньне гэтых машын адбываецца ў недапушчальных умовах.

II. Для зьнішчэньня памянёных у арт. 1 недахопаў:

1) запрапанаваць Белсельсаюзу, Белкалгассаюзу і Белмалкывёласаюзу пашырыць тэмп разгортваньня калгаснага будаўніцтва і вытворчых відаў сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў з такім разьлікам, каб да 1-га мая г. г. гадавое плянавае заданьне было выканана ня менш як на 75 проц.;

2) узмацніць тэмп кампэраваньня асабліва бяднякоў гаспадарак і ўсе маючыяся фонды кампэраваньня беднаты скарыстаць да 1 чэрвеня 1929 г. цалкам;

3) сабраць да 1 чэрвеня гэтага году па ўсіх відах сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў ня менш 60 проц. усяго гадавога заданьня паявога капіталу;

4) запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам і адпаведным арганізацыям узмацніць працу на кантрактацыі і заразжа прыступіць да правядзеньня доўгатэрміновай кантрактацыі і запрапанаваць Белсельбанку выдзеліць патрэбныя сродкі на вытворчыя мэты на доўгатэрміновай кантрактацыі;

5) зьвярнуцца ў Народны Камісарыят Гандлю і ВСНГ СССР з просьбай аб дачы катэгарычнай дырэктывы аб адгрузцы на працягу сакавіка і красавіка месяцаў з боку: «Сельхозснабжения» і Сельсаюза барон і Укрсельмашынтрэсту дзісковых і сашніковых сеялак, планет і сартыровак;

6) запрапанаваць ВСНГ закончыць адгрузку плугоў на працягу двух тыдняў, здачу запасных частак да 15 красавіка, усяго малочнага інвэнтару да 1 мая г. г.;

7) адзначаючы слабы тэмп праводзячыся нарыхтовак насеньня па Аршанскай, Менскай, Бабруйскай, Гомельскай і Магілёўскай акругах, запрапанаваць Белсельсаюзу максымальна ўзмацніць мясцовыя нарыхтоўкі насеннага матар'яду, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на нарыхтоўку канюшины, вікі, лубіну, бульбы і серадэлі.

8. Зьвярнуцца да ўпаўнаважанага па правядзеньню пасеўнай кампаніі пры СПА з просьбай ужыць захады для адгрузкі Саюзхлебам недагружаных па дагавору з Белсельсаюзам 42-х вагонаў вікі.

9. Прасіць Народны Камісарыят Гандлю СССР абавязаць Хімтрэст выканаць дагавор з Белсельсаюзам па адгрузку 5000 тон фасфарытнай мукі, 300 тон сульфатамонія і 1400 тон касьцяной мукі.

10. Запрапанаваць Сталаму Прадстаўніцтву БССР пры ўрадзе СССР зьвярнуць асаблівую ўвагу на выраменьне ўсіх пытаньняў, якія зьвязаны з выкананьнем заявак, да пасеўнай кампаніі як вясеньняй, так і васеньняй, а таксама зьвярнуць увагу на выкананьне заключаных дагавораў прамысловасьцю ў гэтым напрамку.

11. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белсельсаюзу, Белкалгассаюзу ўжыць рашучыя захады для выкананьня пастаноў ураду пра ўзбуйненьне калгасаў.

12. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі па лініі Белмэталётрэсту і Белсамтрамсаюзу выраб да 15 мая г. г. 3000 акучнікаў. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі ўскласьці асабовую адказнасьць на асоб, якім гэта будзе даручана.

13. Даручыць Народным Камісарыятам—Земляробства і Гандлю паставіць пытаньне перад упаўнаважаным Савету Працы і Абароны па правядзеньню пасеўнай кампаніі аб забясьпечаньні суперфасфатам БССР з заданьня на красавік увутранай вытворчасьці, а таксама і забясьпечаньня малочным інвэнтаром вытворчасьці Саюзу ССР.

14. Прыняць да ведама заяву т. Дубіны, што ўсе праэкты і каштарысы на капітальнае будаўніцтва сельска-гаспадарчай кампэрацыяй паданы Народнаму Камісарыяту Земляробства, якому даручыць іх тэрмінова разглядзець.

15. Канстатуючы факт гібелі ад мароазаў значнай колькасьці бульбы па ўсёй Беларусі ў часе хаваньня бульбы ў капцох і прымаючы пад увагу патрэбу снабжэньня спажывецкай бульбай рабочага насельніцтва Масквы і Ленінграду і насеннай бульбай БССР лічыць патрэбным:

а) абавязаць Белсельсаюз загатовіць 200.000 пудоў радавой насеннай бульбы;

б) запрапанаваць Белсельтрэсту і Белдзяржсыпірту зараз-жа спыніць пераапрацоўку на браварнях здаровай бульбы і перайсьці на пераапрацоўку мерзлай бульбы. Запасы здаровай бульбы, якая знаходзіцца ў распараджэньні памянёных арганізацый, забраніраваць для насенных мэтаў;

в) абавязаць Белсельтрэст і Белдзяржсыпірт у тыднёвы тэрмін даць Народнаму Камісарыяту Гандлю поўныя даведкі аб запасах бульбы на заводах;

г) даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю разам з Народным Камісарыятам Земляробства тэрмінова ўстанавіць парадак скарыстаньня забраніраванай бульбы для насенных мэтаў.

16. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі, Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белсельсаюзу ўзмацніць загатоўку мёрзлай бульбы для патрэб прамысловасьці.

17. Зьвярнуць увагу райённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў на ўзмацненьне працы на правядзеньню пасеўнай кампаніі і зрабіць належнае сапрэйнічаньне сельска-гаспадарчай кампэрацыі.

18. Абавязаць акруговыя выканаўчыя камітэты ўзмацніць кіраўніцтва сельска-гаспадарчай кампэрацыяй па правядзеньню пасеўнай кампаніі і кантрактацыі.

19. Даручыць Белсольтрэсту і Белкалгассаюзу ўзмацніць працу на адчыненьні майстэрань па рамонту сельска-гаспадарчых машын.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

20-га сакавіка 1929 г.
гор. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу аб праробленай сельска-гаспадарчай кампэрацыяй працы для правядзеньня вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі.

Выслухаўшы даклады аб праробленай сельска-гаспадарчай кампэрацыяй працы для правядзеньня вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. Адзначыць, што:

а) арганізацыя пярвічных вытворчых аб'яднаньняў дагэтуль ідзе слабым тэмпам. Асабліва слаба арганізуюцца машынныя насеннаводныя, малочна-жывёлагадоўчыя і мэліяратыўныя таварыствы. Недавальняюча ідзе кампэраваньне насельніцтва, асабліва бяднякоў частка яго і зусім дрэнна пастаўлена праца на скарыстаньню выдзелевых фондаў на кампэраваньне беднаты. Слаба і недавальняюча ідзе прыток у сельска-гаспадарчыя аб'яднаньні ўласных сродкаў насельніцтва;

б) поўна разгарнулася праца на кантрактацыі на мясных нагул і зусім ня прыступлена да правядзеньня доўгатэрміновай кантрактацыі; задавальненьне кантрактацыі сродкамі вытворчасьці невыстарчальнае;

в) дырэктывы ўраду пра ўзбуйненьне калгаснага будаўніцтва ажыцьцяўляюцца недастаткова, арганізуецца шмат дробных калектыўных гаспадарак;

г) недастаткова ідзе адгрузка для пасеўнай кампаніі барон, кульціватараў, дзісковых сеялак і зусім дрэнна малочнага інвэнтару і запасных частак. Недавальняюча праводзяцца загатоўкі будыбы і насенных траў, асабліва канюшины, лубіну і вікі;

д) падрыхтоўчая праца на будаўніцтву прадпрыемстваў для перапрацоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў ідзе недавальняюча і да гэтага часу шмат праектаў і каштарысаў не паданы і не зацьверджаны;

е) пеарганізаваны вызначаныя ў пляне майстэрні па рамонту сельска-гаспадарчых машын;

ж) ёсьць шэраг выпадкаў, калі райённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы недастаткова разгарнулі працу для правядзеньня пасеўнай кампаніі і не зьвярнулі выстарчальнай увагі на працу сельска-гаспадарчай кампэрацыі;

з) ёсьць шмат выпадкаў, калі сельска-гаспадарчыя машыны нездавальняюча скарыстоўваюцца і хаваньне гэтых машын адбываецца ў недапушчальных умовах.

II. Для зьнішчэньня памянёных у арт. 1 недахопаў:

1) запрапанаваць Белсельсаюзу, Белкалгассаюзу і Белмалкывёласаюзу пашырыць тэмп разгортваньня калгаснага будаўніцтва і вытворчых відаў сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў з такім разьлікам, каб да 1-га мая г. г. гадавое плянавае заданьне было выканана ня менш як на 75 проц.;

2) узмацніць тэмп кампэраваньня асабліва бяднякоў гаспадарак і ўсе маючыяся фонды кампэраваньня беднаты скарыстаць да 1 чэрвеня 1929 г. цалкам;

3) сабраць да 1 чэрвеня гэтага году па ўсіх відах сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў ня менш 60 проц. усяго гадавога заданьня паявога капіталу;

4) запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам і адпаведным арганізацыям узмацніць працу на кантрактацыі і заразжа прыступіць да правядзеньня доўгатэрміновай кантрактацыі і запрапанаваць Белсельбанку выдзеліць патрэбныя сродкі на вытворчыя мэты на доўгатэрміновай кантрактацыі;

5) зьвярнуцца ў Народны Камісарыят Гандлю і ВСНГ СССР з просьбай аб дачы катэгарычнай дырэктывы аб адгрузцы на працягу сакавіка і красавіка месяцаў з боку: «Сельхозснабжения» і Сельсаюза барон і Укрсельмашынтрэсту дзісковых і сашніковых сеялак, планет і сартыровак;

6) запрапанаваць ВСНГ закончыць адгрузку плугоў на працягу двух тыдняў, здачу запасных частак да 15 красавіка, усяго малочнага інвэнтару да 1 мая г. г.;

7) адзначаючы слабы тэмп праводзячыся нарыхтовак насеньня па Аршанскай, Менскай, Бабруйскай, Гомельскай і Магілёўскай акругах, запрапанаваць Белсельсаюзу максымальна ўзмацніць мясцовыя нарыхтоўкі насеннага матар'яду, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на нарыхтоўку канюшины, вікі, лубіну, бульбы і серадэлі.

8. Зьвярнуцца да ўпаўнаважанага па правядзеньню пасеўнай кампаніі пры СПА з просьбай ужыць захады для адгрузкі Саюзхлебам недагружаных па дагавору з Белсельсаюзам 42-х вагонаў вікі.

9. Прасіць Народны Камісарыят Гандлю СССР абавязаць Хімтрэст выканаць дагавор з Белсельсаюзам па адгрузку 5000 тон фасфарытнай мукі, 300 тон сульфатамонія і 1400 тон касьцяной мукі.

10. Запрапанаваць Сталаму Прадстаўніцтву БССР пры ўрадзе СССР зьвярнуць асаблівую ўвагу на выраменьне ўсіх пытаньняў, якія зьвязаны з выкананьнем заявак, да пасеўнай кампаніі як вясеньняй, так і васеньняй, а таксама зьвярнуць увагу на выкананьне заключаных дагавораў прамысловасьцю ў гэтым напрамку.

11. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белсельсаюзу, Белкалгассаюзу ўжыць рашучыя захады для выкананьня пастаноў ураду пра ўзбуйненьне калгасаў.

12. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі па лініі Белмэталётрэсту і Белсамтрамсаюзу выраб да 15 мая г. г. 3000 акучнікаў. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі ўскласьці асабовую адказнасьць на асоб, якім гэта будзе даручана.

13. Даручыць Народным Камісарыятам—Земляробства і Гандлю паставіць пытаньне перад упаўнаважаным Савету Працы і Абароны па правядзеньню пасеўнай кампаніі аб забясьпечаньні суперфасфатам БССР з заданьня на красавік увутранай вытворчасьці, а таксама і забясьпечаньня малочным інвэнтаром вытворчасьці Саюзу ССР.

14. Прыняць да ведама заяву т. Дубіны, што ўсе праэкты і каштарысы на капітальнае будаўніцтва сельска-гаспадарчай кампэрацыяй паданы Народнаму Камісарыяту Земляробства, якому даручыць іх тэрмінова разглядзець.

15. Канстатуючы факт гібелі ад мароазаў значнай колькасьці бульбы па ўсёй Беларусі ў часе хаваньня бульбы ў капцох і прымаючы пад увагу патрэбу снабжэньня спажывецкай бульбай рабочага насельніцтва Масквы і Ленінграду і насеннай бульбай БССР лічыць патрэбным:

а) абавязаць Белсельсаюз загатовіць 200.000 пудоў радавой насеннай бульбы;

б) запрапанаваць Белсельтрэсту і Белдзяржсыпірту зараз-жа спыніць пераапрацоўку на браварнях здаровай бульбы і перайсьці на пераапрацоўку мерзлай бульбы. Запасы здаровай бульбы, якая знаходзіцца ў распараджэньні памянёных арганізацый, забраніраваць для насенных мэтаў;

в) абавязаць Белсельтрэст і Белдзяржсыпірт у тыднёвы тэрмін даць Народнаму Камісарыяту Гандлю поўныя даведкі аб запасах бульбы на заводах;

г) даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю разам з Народным Камісарыятам Земляробства тэрмінова ўстанавіць парадак скарыстаньня забраніраванай бульбы для насенных мэтаў.

16. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі, Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белсельсаюзу ўзмацніць загатоўку мёрзлай бульбы для патрэб прамысловасьці.

17. Зьвярнуць увагу райённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў на ўзмацненьне працы на правядзеньню пасеўнай кампаніі і зрабіць належнае сапрэйнічаньне сельска-гаспадарчай кампэрацыі.

18. Абавязаць акруговыя выканаўчыя камітэты ўзмацніць кіраўніцтва сельска-гаспадарчай кампэрацыяй па правядзеньню пасеўнай кампаніі і кантрактацыі.

19. Даручыць Белсольтрэсту і Белкалгассаюзу ўзмацніць працу на адчыненьні майстэрань па рамонту сельска-гаспадарчых машын.

20. У зьвязку з тым, што дадзены значныя льготы па абкладаньні буйнае рагатае жывёлы, даручыць Белжылмалсаюзу ўзмацніць працу на кампэраваньню і росту малочных аб'яднаньняў.

21. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам і спадпаведным арганізацыям ужыць захады для правільнага скарыстаньня і хаваньня сельска-гаспадарчых машын.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

25 сакавіка 1929 г.,
г. Менск.

ЯК ЯНЫ „АБВЯРГАЮЦЬ".

Самакрытыка зьявілася новым, зусім новым момантам у нашым будаўніцтве. Самакрытыка выкрыла і працягвае выкрываць балячкі ў нашым апараце і разам з гэтым дапаматла і дапамагае ўдзелам усіх працоўных палепшыць і рацыяналізаваць працу. Падкрэсьліваючы ролю друку і рабськораў у самакрытыцы, неабходна зазначыць, што за гэты час адбылося своеасаблівае разьмеркаваньне працы паміж рабселькорамі і рэдакцыяй—з аднаго боку, і савецкімі бюракратамі—з другога: першыя пішуць, зьмяшчаюць допісы, а другія—супроць гэтай «атруты»: пабегаўшы палахліва па сваіх утульных і прыемных габінэтах паважна пішуць абвяржэньне.

Перад намі абвяржэньне надрукаванае на аркушы тонкай паперы са штампам і за подпісам «яго самога»—сэкратара Жлобінскага Райкампарту Пушчына і нават з нумарам. Пачынаецца абвяржэньне таксама з нумару, пры чым паведамляецца: «На заметку ў газэце «Савецкая Беларусь» за 14-XII 1928 г. пад назвай «падсудны на адказнай працы» адказваем, што т. Мехаў працаваў у дзіцячай калёніі ў якасьці загадчыка гаспадаркі.

Мехаў сябе не апраўдаў таму, што мае слабую агульна-адукацыйную падрыхтоўку, ня мае пэдагагічных ведаў і ня мог сябе паставіць сярод дзяцей, як выхавацца. За гэта Мехаў быў райкомам КП(б)Б зьняты з працы і прыцягнуты да судовае адказнасьці, дзе і атрымаў год умоўна».

Дзіўна, т. Пушчын, дзіўна!.. Загадчык гаспадаркі быў кепскім выхавацелем—нябожчык кепска скакаў. Яшчэ больш дзіўна—атрымаў год умоўна затым, што ня меў пэдагагічных ведаў. Гэта па вашаму... Падумайце, можа ўспомніце, што ён зрабіў, акрамя гэтага.

Едзем далей. На допіс «Яшчэ дагэтуль рыхтуецца» «Сав. Бел.» № 27—„абвяржэньне" напісана алоўкам.

Лясьнічы Гарадзецкага лясьніцтва, Бабруйскай акругі, Раждзественскі паведамляе: «Лясьніцтва дровы насельніцтву пачало адпускаць з 1 лютага, таму, што сельсаветы не прадставілі раней сьпісаў, прычым розныя кампаніі адсунулі гэту працу на задні плян».

Правільна, т. Раждзественскі, перад рэдакцыяй вы сябе «апраўдалі», але не апраўдалі сябе перад насельніцтвам. Усё-ж радзім вам замест паэзіі заняцца прозаю і замест «ламаньня ў адчыненых дзьверы» сказаць проста: вінават, што ў свой час ня ставіў пытаньня перад РВК аб хутчэйшым атрыманьні сьпісаў, каб выдаць апал не на вясну, а на зіму.

„Абвяржэньне" № 3. Ужо не абвяржэньне, а адказ на дасланы допіс, для расьсьледваньня. Паперу падпісаў «сам» упаўнаважаны Гомельскай АКК па Рэчыцкаму райёну Ласман. Здаецца, усё добра, але-ж не, пачакайце! У допісе пасланым на расьсьледаваньне паведамляецца, што ў Баравікоўскім спажывецкім таварыстве ёсьць загадчык крамы Дэмідэнка, ён-жа член сельсавету, які робіць злачынствы. Злачынствы ён робіць разам з сэкратаром сельсавету Чарэднікам — кандыдатам КП(б)Б. Ласман паведамляе, што Дэмідэнка прыцягнут да судовае адказнасьці. А далей «што датычыцца Чарэдніка, дык факт паведамлен парторганізацыі—для ведама».

Дзіўна, т. Ласман! Беспартыйнага прыцягваюць да судовае адказнасьці, а аб злачынцы, кандыдату партыі, паведамляюць «да ведама». Вы, мусіць, хацелі сказаць, што ня прыняли аб партыйцу паведамляць. І гэта ў той час, калі партыя заклікае ўсіх працоўных дапамагчы ачысьціць яе шэрагі ад варожых людзей.

На ўсе паведамленьні кажам адно: **больш адказнасьці за справу, менш плаваньня і больш увагі да допісаў.**

Гальскі.

ХРОНІКА.

РАЙЁННЫЯ ЗЬЕЗДЫ САВЕТАЎ ВІТАЮЦЬ ЦВК БССР.

Прэзыдум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад Грэскага, Крычаўскага, Расонскага, Хойніскага, Дрысенскага, Гарадоцкага, Бярэзінскага, Самахвалавіцкага, Сьмілавіцкага, Чашніцкага, Крупскага і Буда-Кашалёўскага райённых зьездаў саветаў.

Зьезды саветаў, вітаючы вышэйшы орган савецкай улады на Беларусі, заявляюць, што яшчэ з большай напружанасьцю павядуць працу па ўзьнаўленьню народнай гаспадаркі,—індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі вёсні.

ЗА НЕВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ—ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

ЦК Камітэту сялянскай узаемаданамогі пастанавіў прыцягнуць да судовай адказнасьці старшыню Халопенецкага РКСУ т. Лябіка за дрэнную падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы.

Тав. Лябік да апошняга часу на оклаў плану вясеньняй сяўбы; нічога не рабілася ў яго і ў галіне зерначышчэньня, арганізацыі працоўных дружын, кампэраваньня беднаты, спагнаньня запазычанасьці.

Дазнаючы гаспадарыню Лябіка, падрыхтоўка да сяўбы ў Халопенецкім райёне па лініі НСУ зусім дэзарганізавана.

300 ПУД. ПОПЕЛУ ДЛЯ БЕДНАТЫ.

Сеньніцкі к-т сялянскай узаемадапамогі, Самахвалавіцкага р. па сваёй ініцыятыве пачаў зьбіраньне попелу ў розных установах г. Менску. Да гэтага часу к-т ужо сабраў 300 пуд. попелу, а да вясны мяркуецца сабраць яшчэ значную колькасьць гэтага ўгнаеньня.

Попел будзе разьмяркоўвацца для ўгнаеньня палёў бяднейшых сялян.

НКЮ і пасеўная кампанія.

Наркамюст запрапанаваў органам пракурорскага нагляду наглядаць за своечасовым выкананьнем дзяржаўнымі і кампэрацыйнымі арганізацыямі ўскладзеных на іх заданьняў па павышэньні вясеньняй пасеўнай кампаніі, каб нотым выдаваемыя мясцовымі органамі пастановы аб абавязковых агра-мерапрыёмствах былі магчымы для выкананьня насельніцтва і прынесілі значную карысьць у справе ўзьнаўленьня ўраджайнасьці.

Абсьледваньне дамоў г. Менску.

28 га сакавіка ў кампасе адб[illegible] нарада рабочых дружын па пытаньні аб мэтадах абсьледваньня камунальных, жаткаўскіх і прыватніцкіх дамоў. У абсьледваньні прыме ўдзел да 200 рабочых. Абсьледваньне ставіць мэтай выявіць некрацоўны элемэнт у камунальных і жаткаўскіх домах і праверыць, як выкарыстоўваецца 30-процэнтны плян у прыватных домах. Абсьледваньне будзе праводзіцца ў ударным парадку і будзе закончана ў самы кароткі тэрмін.

Будзе арганізавана 70 палявых дзіцячых ясьляў.

Сёлета ў Менскай акрузе будзе адчынена 70 палявых дзіцячых ясьляў, якімі будзе ахоплена звыш 2000 дзяцей. З агульнай колькасьці 14 ясьляў будзе арганізавана ў саўгасах Менщчыны за рахунак саюзу працаўнікоў зямлі і лесу і лекавага фонду. Белкаапсаюз адчыніць 10 ясьляў па калгасах і вёсках.

Курсы сялянак батрачак-актывістак.

15 красавіка ў Менску адчыняюцца курсы па ахове матэры і дзіцяці для падрыхтоўкі сялянак і батрачак-актывістак на працу ў летніх дзіцячых ясьлях. Праграма курсаў разьлічана на 6 тыдняў; на іх з усіх райёнаў Менщчыны будзе накіравана 70 жанчын. Для практычнай працы курсантак у адной з [illegible] вёсак будуць арганізаваны [illegible] ясьлі.

Утрыманьне курсаў абыдзецца каля 3500 руб.

Да падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых для хлебазаводаў.

Дзеля падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочай сілы для хлебапякарняў прамысловасьці—НК РСІ лічыць неабходным арганізаваць вучнёўскія брыгады пры хлебазаводах, а таксама курсы для пераквалфікацыі і тэарэтычнай падрыхтоўкі рабочых.

Гэта пытаньне даручана распрацаваць НК Асьветы і іншым зацікаўленым установам.

Каля прыляціць у Менск самалёт „Усе ў Асо-Авіахім".

Водлуг вестак ЦС Асо-Авіахіму, самалёт «Усе ў Асо-Авіахім», які зараз знаходзіцца ў Бабруйску, в прычыны таяньня сьнегу, ня зможа падняцца; ён прыляціць у Менск у пачатку мая.

Праверка работы нізавых выбарчых камісій.

Менская акруговая выбарчая камісія праз сваіх упаўнаважаных распачынае працу па праверцы работы райённых, местачковых і сельскіх выбарчых камісій дзеля высьвятленьня, наколькі на мясцох правільна пазбаўлялі выбарчых правоў.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» наступныя часопісы.

1. **«Хозяйство печати» № 1, за 1929 г.** Штомесячны журнал выдавецкай палітыкі фінансаў, вытворчасьці і гандлю. Стар. 64, цана 60 кап. Выданьне Наркамгандляе СССР і РСФСР. Масква.

2. **«Асьвета» №№ 1 і 2, за 1929 г.** Штомесячны часопіс Народнага Камісарыяту Асьветы і саюзу працаўнікоў асьветы. Цана 80 кап. Выданьне Наркамасьветы БССР. Менск.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.
КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 27-3-29 г.

	Куп.	Прод.
1-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	4—83,5	—
2-я 6 проц. залатая выйгрышная пазыка	5—00	—
Бяспроц. пазыка 26 г.	122—00	124—00
10-проц. дзярж. выйгрышная пазыка 27 г.	25—49	25—50
6-я дзяр. індустрыял.	25—83,5	25—93,5
3-я сялянская 1927 г.	5—04,5	— —
12-проц. рэнтн. 1927 г.	103—83	—
2-я пазыка індустрыял. проц. вып.	26—26	26—36
2-я індустрыял. бяспроц.	25—88	25—34
11 проц. унутран.	100—76	100—81

Аблавяшчэньні.
ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня кіно—«Норд-Ост» а 7 з пал. і 9 з пал. г. уз.

Групком № 7 саюзу працасьветы паведамляе, што 28-3 а 7 гадз. увеч. у Доме Асьветы адбудзецца агульны сход акраёў 7-га групкому.

Паветка дню:

1. Справаздача 4-га дзіцячага саду, запрашаюцца працаўніці усіх дашкольных устаноў гор. Менску. Групком 7.

ПЭДГАБІНЭТ.

У чацьвер, 28 сакавіка, у 7 з пал. гадзін увечары адбудзецца пасяджэньне секцыі „грамадзка-нарысная працы школы"

На абвестку дню—даклад практыкавання-паказальнай школы пры Белпэдтэхнікуме (11 школы).

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

Водгукі на карэспандэнцыі.

ДАЗОРЦАЎ БУДЗЕ ВЫКЛЮЧАНЫ З АКАДЭМІІ.

У допісе—«Мятлой такіх», паданым на рассьледваньне, паведамлялася, што ў Сельска-Гаспадарчай Акадэміі ёсьць студант Дазорцаў, які вылучаецца сынам вядомага кулака і эксплёататара в. Рыбкова Дрысенскага райёну.

На допіс ячэйка КП(б)Б Горацкай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі паведамляе, што зазначаныя факты рассьледваньнем пацьвердзіліся і ўзьнята пытаньне аб выключэньні Дазорцава з Акадэміі.

ЗАКРЫТАЯ ВАГАНЕТКА БУДЗЕ ЗРОБЛЕНА.

У допісе «32 кілёмэтры па чыгунцы канём», зьмешчаным у № 18 за 25-I, паведамлялася, што ў Мазырскай акрузе ёсьць завод Лесбелу „Труд". Завод знаходзіцца ва 32 кілёмэтры ад станцыі і да яго праводзена чыгунка, але праехаць па гэтай чыгунцы нельга, асабліва ўзімку, бо ідзе адкрытая вагонетка.

На гэты допіс ячэйка КП(б)Б заводу «Труд» паведамляе, што зараз прыняты меры да набудовы закрытай вагонеткі для пасажыраў.

СЕЛЬСАВЕТ ДА СЯЎБЫ РЫХТАВАЎСЯ.

У допісе «Зрыў пасеўкампаніі», паданым на рассьледваньне, паведамлялася, што старшыня і сэкратар Латыскага сельсавету (складу 1928 г.) дрэнна адносіліся да падрыхтоўкі асенняй сяўбы і гэтым зрывалі кампанію. Рассьледваньнем устаноўлена, што Латыскі сельсавет да асенняй сяўбы рыхтаваўся. Але разам з гэтым устаноўлена, што былы старшыня Латыскага сельсавету прысвоіў сабе 15 руб. з сродкаў КСУ, за што прыцягнут да судовай адказнасьці.

ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЕ І ЗБОР ПОПЕЛУ ПАШЫРАЮЦЦА.

На допіс «Абозы на ачыстку насеньня бязьдзейнічаюць», у якім паведамлялася аб кенскай падрыхтоўцы да вясеньняе сяўбы ў Хойніскім раёне, акраграном паведамляе наступнае: за апошні час зернаачышчэньне значна пашырылася, Хойніскі райён выканаў заданьне на 15-е сакавіка на 42 проц., таксама пашыран збор попелу, які дасягае да 20.000 пудоў па акрузе.

ЗАМОЖНІКІ З ПРАФСАЮЗУ ВЫКЛЮЧАНЫ.

У допісе—„Рабачком асекрадначыўся", паданым на рассьледваньне, паведамлялася, што ў Белабрыскім рабачкоме працаземлесу шмат сяброў серадняку, нават і заможнікаў, якія працуюць у лясьніцтве